PL ISSN 0546-1960
NR INDEKSU 366714

Ніва

ТЫДНЁВІК БЕЛАРУСАЎ У ПОЛЬШЧЫ

http://niva.iig.pl
redakcja@niva.iig.pl

№ 45 (2478) Год XLVIII | Беласток, 9 лістапада 2003 г. | Цана 2,00 зл.

X Бардаўская восень, 24-26 кастрычнік, Беласток-Бельск-Гайнаўка

Пад знакам Камоцкага і Вайцюшкевіча

Мікола Ваўранюк

„Бардаўская восень" была такая добрая, што аж не хочацца пісаць! Прычапіцца няма да чаго, а самая хвальба заўсёды выклікае падазрэнні, што тэкст спансараваны. На сваё апраўданне ў мяне гісторыя маіх стасункаў са Звязам беларускай моладзі. У каго-каго, але ў мяне арганізатары „Бардаўскай восені" тэксту пра імпрэзу напэўна не заказалі б!

Пасля такой засцярогі, думаю, магу падзяліцца некалькімі *аб'ектыўнымі*, а пры тым асабістымі заўвагамі і ацэнкамі. Дзесяты юбілейны выпуск фестывалю да гэтага схіляе.

Віктар Шалкевіч — гарадзенскі бард і актор — абышоўся з юбілеем без цырымоніяў:

— Калі ідзеш на 155-ы фестываль беларускай песні і чуеш усё тое ж: „Касіў Ясь канюшыну", — Шалкевіч з грымасай дэманструе перажыванні артыста на сцэне, якія можна параўнаць з болем

Фота ЗОСІ ЛЕМЕШ

Зміцер Вайцюшкевіч

зуба, — то нават найбольшыя патрыёты губляюць энтузіязм. Кожнае мерапрыемства павінна мяняцца. „Бардаўская восень" пачыналася вельмі цікава, тут можна было пабачыць сапраўдныя маладыя таленты, як хаця б „Белы сон" з Янкам Хохам і Мартай Драль. А потым нешта акасцянела.

Віктар Шалкевіч з характэрнай яму сціпласцю прамаўчаў, што сам у 1994 годзе быў маладым перспектыўным талентам і лаўрэатам Гран-пры першай „Бардаўскай восені". Але нешта ў яго

[працяг ☞ 3]

Фота АЛЯКСЕЯ МАРОЗА

Спяваю з дзяцінства

Размова з Маргарытай КАРПЮК, вучаніцай Комплексу школ з дадатковым навучаннем беларускай мовы ў Гайнаўцы.

— Дабілася ты поспехаў у перадачы „Ідал" на тэлеканале „Польсат". Зараз знаходзішся ў фінале спаборніцтваў у ліку дзевяці асоб, якіх найвышэй ацаніла польская публіка. Як гэта ўспрымаеш?

— Гэты конкурс з'яўляецца для мяне добрай гульнёй. Хаця, гледзячы з другога боку, гэта таксама вялікі поспех. З ліку дзевяці тысяч кандыдатаў засталося нас толькі дзевяць асоб. Можа нехта мяне заўважыць і выйдзе з нейкай прапановай.

— Раней былі поспехі ў беларускіх конкурсах. Ці ад іх пачалося спяванне?

— Спяваю з дзяцінства. Спачатку я калядавала разам з сябрамі ў Бярнацкім Мосце і Лешуках, дзе жылі мае бабулі. Пасля выступала ў школьных конкурсах. Ніхто не прымушаў мяне да спявання, але было яно ў мяне нечым натуральным. Больш сур'ёзна я зацікавілася спевам, калі паступіла ў белліцэй і стала выступаць у „Знічцы". У белліцэі я вышкаліла свой голас і асвоілася са сцэнай. У „Знічцы" вельмі добрая атмасфера. Была магчымасць спяваць фальклорныя беларускія песні, што мяне вельмі цікавіла. Апошні этап, гэта выступленні з гуртом „Broken Head" з Гайнаўкі.

— Як трапіла ты на конкурс тэлеканала „Польсат"?

— Раней я асабліва не цікавілася гэтым конкурсам. Ад сяброўак даведалася, што ў Гайнаўцы будзе праводзіцца адбор і рашылася ў ім выступіць. Падрыхтавала беларускую і польскую песні і падалася ў Гайнаўскі дом культуры, дзе выступіла з сарака іншымі асобамі. У чарговы этап перайшло нас трое.

— Чаму ты рашылася на беларускую песню?

— Я хацела паказаць сваю культуру.

— Як праходзілі конкурсныя спаборніцтвы ў чарговых элімінацыях?

— Пасля элімінацый у пачатку жніўня засталося асоб 120. У пачатку верасня конкурснае спяванне адбылося ў Вялікім тэатры ў Варшаве, у час якога адабралі 35 чалавек. Чарговыя адборы праходзілі ў студыі тэлебачання „Польсат". Сярод публікі былі мае сябры, якія падтрымлівалі мяне ў спаборніцтвах. Спачатку засталося нас дзесяць асоб, а зараз дзевяць.

— Як ты адчувала сябе, ведаючы, што па тэлебачанні глядзіць на цябе шмат публікі?

— Была вялікая канкурэнцыя і таму я крыху хвалявалася. Старалася я весці сябе ў студыі натуральна і думаю, што натуральнасць мне і дапамагла. Магло б атрымацца яшчэ лепш. Але, калі публіцы падабалася, значыць, было добра.

— Ці ты сама падбіраеш рэпертуар?

— Спачатку сама я падбірала песні. Былі яны дынамічныя і я іх адчувала. На апошнім этапе мусіла я выбіраць са спіска, прапанаванага арганізатарамі. Рашылася я на песню „Тэлефоны" гурту „Рэспубліка", бо люблю гэты стыль.

— Хто памагаў табе рыхтавацца?

— Спачатку рыхтавалася сама. Пасля дапамагала мне цёця Мая Карпюк, якая працуе ў музычнай школе ў Варшаве. Зараз працую з нашай настаўніцай Бажэнай Ляўчук. Можна таксама карыстацца дапамогай спецыялістаў запрошаных арганізатарамі, але на працу з імі застаецца мала часу.

— Як успрынялі твае поспехі сябры і сямейнікі?

— У школе ўсе віншуюць і радуюцца маімі поспехамі. Бацькі вельмі задаволеныя, што я перайшла ў фінал.

[працяг ☞ 2]

Віцебская трупа ў Гайнаўцы ☞ 3

Пётр Ламан перад ліцэістамі дэкламаваў свае вершы. Выдаў ён тры паэтычныя зборнікі: „Споведзь агню", „Стары млын" і „Зерне імгненняў". Піша на беларускай мове. Некаторыя творы былі перакладзены на рускую мову. Сам пераклаў з польскай на беларускую мову „Мужа і жонку" Аляксандра Фрэдры.

Канцлагер у Картуз-Бярозе ☞ 4

У Картуз-Бярозу санацыя пасылала дзеячаў украінскіх і беларускіх, апазіцыйных польскіх партый, камуністаў, спекулянтаў і крымінальнікаў. Апошняя катэгорыя зняволеных часта выкарыстоўвалася паліцыяй у праследаванні палітзняволеных. Крымінальнікі выконвалі функцыі інфарматараў, назначаліся дзяжурнымі, мелі права беспакарана біць палітычных.

Самакіраванне па-над межамі ☞ 5

Удзельнікі стажыроўкі прысутнічалі на сесіі Рады Белавежскай гміны і спаткаліся з войтам Аннай Байко. Наведалі Дырэкцыйны парк і прыватны скансэн каля Белавежы. Госці з Беларусі цікавіліся пытаннямі сацыяльнай дапамогі і з гэтай мэтай наведалі ў Белавежы дом сацыяльнай дапамогі „Ракітнік", а ў Гайнаўцы — Гарадскі асяродак сацыяльнай дапамогі, Павятовы цэнтр дапамогі сям'і і Дом самадапамогі.

„БАС" — не пагас! ☞ 8

Атрасіны беластоцкіх студэнтаў ужо чарговы раз адбыліся ў Супраслі, у гасцінай дачы спадарства Латышонкаў. Ноччу з 17 на 18 кастрычніка гуляла тут за трыццаць басаўцаў ды не толькі... Шкада толькі, што студэнцкія „Атрррррасіны", ужо з добрых дзесяць гадоў адбываюцца ў малым крузе і датычаць яны ў асноўным толькі студэнтаў беларусістыкі.

Мінаюць гады, астаюцца ўспаміны ☞ 10

Праходзілі гады і Юліка прызвалі ў войска. Службу ад 6 кастрычніка 1925 года да 25 кастрычніка 1927 года ў кавалерыйскім 3 палку швалежэраў у Сувалках закончыў ён у званні старшага швалежэра.

Рысь у Белавежскай пушчы ☞ 11

У Польшчы ў 1990 г. было 408 рысяў, з чаго ацэньвалася, што ў Белавежскай пушчы было іх 10-16 штук. Зімою 1991/92 у выніку браканьерства і адстрэлаў на беларускім баку пушчы лік дарослых рысяў паменшаў да пяці штук.

9 770546 196000

Беларусь — беларусы

Хто наступны?

І зноў павеяла сумам. У канцы кастрычніка Вярхоўны суд Рэспублікі Беларусь задаволіў зыск Міністэрства юстыцыі ў справе ліквідацыі адной з найбольш паважаных у рэспубліцы і па-за яе межамі няўрадавай арганізацыі — Праваабарончага цэнтра „Вясна". Узнікла яна ў 1996 г. з мэтай давесці беларускаму грамадству важнасць патрэбы змагання за правы чалавека і непасрэдна дапамагаць рэпрэсаваным дзяржаўнай сістэмай. Адказнасць і заангажаванасць людзей, што стваралі структуру арганізацыі ва ўсёй краіне, хутка прынесла вынікі. Грамадскія прыёмныя, дзе бясплатна можна было атрымаць юрыдычную дапамогу, штодзённая аператыўная і прафесіянальная інфармацыя пра парушэнні законаў у дачыненнях дзяржава — грамадзянін, распаўсюджваная ў Беларусі і замежжы ў выглядзе прэс-рэлізаў і штогадовых рапартаў, заангажаванасць у падтрымку сем'ям загінуўшых апазіцыйных палітыкаў і журналістаў — усё гэта не было да спадобы ўладзе. Яшчэ адной станоўчай якасцю ў працах „Вясны" пад кіраўніцтвам Алеся Бяляцкага быў ейны беларускамоўны воблік. Бо на жаль, а гучыць гэта як жахлівы парадокс, у Беларусі адным з найчасцей парушаных правоў чалавека і грамадзяніна з'яўляецца абмяжоўванне дзяржавай беларускамоўнай адукацыйнай і інфармацыйнай прасторы ў карысць русіфікацыі. І калі ў 2001 г. у час прэзідэнцкіх выбараў Бяляцкі ачоліў структуру незалежнага назірання за іх правядзеннем, якая зафіксавала факты фальсіфікацыі і парушэння ўладай выбарчага закону, усім стала зразумелым, што дзяржаўныя служкі гэтага не забудуць. Цэнтральная выбарчая камісія вынесла „Вясне" папярэджанне за ангажаванасць у працэс назірання, а з загаду Міністэрства юстыцыі распачаліся ў арганізацыі шматлікія праверкі, мэта якіх была адна — ліквідаваць структуру „Вясны".

Ліквідацыя па палітычным заказе

„Ганьба, ганьба" — такія словы прагучалі 28 кастрычніка ў зале Вярхоўнага суда, калі суддзя Валянціна Кулік прызнала зыск Міністэрства юстыцыі пра ліквідацыю праваабарончай арганізацыі. Суддзя аднак у цэлым захавала крыху свой прафесійны твар: адкінула ў вынесеным прысудзе ўсе тыя адміністрацыйныя закіды мінюста, якія быццам былі знойдзены ў час праверак, а сваё рашэнне прыняла на аснове толькі аднаго вышэйзгаданага папярэджання з боку Цэнтральнай выбарчай камісіі. Такім чынам яна прадэманстравала, што ліквідацыя „Вясны" мае толькі і выключна палітычны характар. Трэба зазначыць, што ў выніку патрабаванняў абвінавачаных увесь судовы працэс быў ведзены на беларускай мове, а сакавітая беларуская мова ў вуснах суддзі Кулік дае спадзяванні, што чынавенства ў любы момант можа нармальна ёю карыстацца. На сёння аднак малая ад гэтага радасць для ліквідаванай арганізацыі, што выслухалі прысуд на роднай мове. Старшыня арганізацыі Алесь Бяляцкі перад суддзёю заявіў: „Няўрадавыя арганізацыі зноў, як і пры камуністах, заганяюцца ў падполле, а ўлады бачаць у іх не партнёра ў грамадскіх узаемадачыненнях, а суперніка і нават ворага, якога неабходна знішчыць. Прыклад „Вясны" — тут проста класічны".

Ужо сёння можна адкрыта сказаць, што 2003 год сумны для беларускіх няўрадавых арганізацый: сёлета ўключна з „Вясною" было ліквідаваных 19 арганізацый рознага напрамку і кшталту дзейнасці. Чым жа правінавацілася грамадзянская супольнасць Беларусі перад такой атакай з боку ўладаў? Адказу трэба шукаць у недалёкім мінулым і хуткім будучым.

Прэзідэнцкія выбары 2001 года паказалі, што рэальны арганізацыйны патэнцыял беларускай дэмакратычнай супольнасці ў большасці замацаваўся ў няўрадавых арганізацыях, чымсьці ў зацкаваных уладай палітычных партыях. Для вялікай большасці актыўнага палітычна беларускага грамадства зусім незразумелым і неўспрыймальным аказаўся спосаб вылучэння незалежнага кандыдата як і сам кандыдат у прэзідэнты. У такой сітуацыі партыйныя лідэры нат як дэкларавалі сваю працу ў карысць прафсаюзніка Ганчарыка, то звычайныя сябры партыі занадта не хацелі ўдзельнічаць у тым, у што проста не верылі. Відавочным стала, што цяжар арганізацыйнай працы лёг на плечы трэцяга сектара, які з большымі ці меншымі поспехамі спраўляўся з патрабаваннямі выбарчага змагання. Улады пабачылі, што няўрадавыя арганізацыі, так як і незалежныя сродкі масавай інфармацыі, з'яўляюцца істотным фактарам для беларускай рэчаіснасці. На практыцы абазначала гэта наступ на дзве гэтыя вельмі важныя часткі кожнай дэмакратычнай дзяржавы. Доказам значэння ўзрастаючай ролі няўрадавага руху ў грамадстве сталі выбары ў мясцовыя саветы вясной гэтага года. Сярод кандыдатаў ад дэмакратычных сілаў, якім пашчасціла ў няроўным змаганні з кандыдатамі ўлады перамагчы і стаць дэпутатамі, большасць звязана была з трэцім сектарам. І вось праз год, у 2004 г., у Беларусі чарговыя выбары, гэтым разам у гэтак званаю „палатку" — мясцовы парламент. У сувязі з падзеямі, якія чакаюць беларускі народ у наступным скліканні парламента, аўтарытарная сістэма не хоча дапусціць туды істотнай групы ад дэмакратычнай апазіцыі. Будучыя парламентарыі праўдападобна будуць рашаць аб удзеле Аляксандра Лукашэнкі ў прэзідэнцкіх выбарах на трэці тэрмін. Згодна з канстытуцыяй пасля другога тэрміну сваёй улады Лукашэнка павінен яе аддаць. Але калі народ папросіць, а палата зменіць канстытуцыю... Усё магчымае. Другая справа — ратыфікацыя народнымі абраннікамі, невядома яшчэ толькі ў якім выглядзе, галоўнага козыра прэзідэнта — абяцанага раю ў выглядзе Саюза Беларусі і Расіі. Таму абсалютна не могуць патрапіць у парламент людзі іншага складу думкі. Мо некалькі асобаў ад апазіцыі. Толькі на тое, каб суцішыць сусветную супольнасць і легімітызаваць беларускую заканадаўчую ўладу ў міжнародных структурах. Дзеля гэтага на сённяшні дзень для ўлады самай важнай задачай з'яўляецца максімальнае паслабленне арганізаванай дэмакратычнай структуры. Няўрадавыя арганізацыі — гэта канкурэнтаздольная структура, якую ліквідуецца па палітычнаму заказу. Не можа быць аніякага поля для палітычнай гульні. Ёсць толькі месца для адной фігуры. Таму ў хуткім часе атрымаем, на жаль, адказ пра наступную ахвяру гэтых зачыстак.

Яўген Вапа

Галадоўка ваўкавыскіх таксістаў

Пэўна адной з яскравых і ў той жа час трагічных падзей жыцця беларускага бізнесу гэтага года можна назваць кастрычніцкую галадоўку ваўкавыскага ўладальніка фірмы „Радыё-таксі 22222" і ягоных работнікаў. Больш таго, гэтая падзея паказала, што людзі ў Беларусі здольныя змагацца за свае правы, зразумела, калі яны гэтага захочуць.

Гісторыя канфлікту прадпрымальніка з мясцовымі падатковымі ўладамі разгортвалася вельмі імкліва. Яшчэ да сярэдзіны гэтага года ўсё было добра. Справа, якой займаецца Мікалай Аўтуховіч, задавальняла не толькі яго і маючых ад гэтага працу шафёраў, дыспетчараў і іншых супрацоўнікаў, а таксама кліентаў, але і навакольныя ўстановы і арганізацыі. Хто толькі не прасіў ва ўдачлівага бізнесмена грошы — і мясцовая вертыкаль, і ваенны камісарыят, і дзіцячы дом, і праваслаўная царква, і іншыя, і іншыя. Нікому не было адмовы. Але ўсё гэта ў мінулым і не стала індульгенцыяй у вачах прыгнятальнікаў прыватнай ініцыятывы ў Беларусі. Цяпер прадпрымальнік і ягоныя работнікі без суда пакараныя. Такія рэаліі беларускай прававой сістэмы ў галіне падаткаабкладання.

А рыба, як гаворыцца, гніе з галавы. У маі гэтага года прэзідэнт А. Лукашэнка прымае дэкрэт № 4, па якім прыватным прадпрымальнікам забараняецца прымаць на працу больш за тры асобы. Калі ліміт перабольшаны, то маючы камерцыйную жылку чалавек мусіць паіншаму сплачваць падаткі, якія ў даным выпадку змяняюцца ў бок павелічэння. Літаральна ў апошнія дні гэты дэкрэт ператварыўся ў закон, прыняты беларускім парламентам. Натуральна, што сутнасць яго не змянілася. А па дзеючай Канстытуцыі дэкрэты прэзідэнта ў Беларусі прыраўнаныя да законаў, якія прымаюць дэпутаты.

Нельга казаць, што М. Аўтуховіч абыякава паставіўся да прынятага вышэйшай уладай дакумента. Афіцыйна ён пакінуў у сябе траіх работнікаў, астатнія былі пераведзены ў штат партнёрскай фірмы і, нягледзячы на тое, што фактычна засталіся працаваць на былых сваіх пасадах, фармальна былі афармлены як працуючыя па часовых дамовах. Такі крок не з'яўляецца нейкім парушэннем заканадаўства — за ўсё плацяцца падаткі. Больш таго, такая схема вядзення сваёй справы рэкамендуецца перыядычнымі сродкамі масавай інфармацыі на бізнес-тэматыку. Але для падатковай інспекцыі, з кіраўніцтвам якой у галадаючага прадпрымальніка калісьці ўзнік канфлікт, закон як дышаль — вярці ім як хочаш. Абвесціўшы правінцыйнага бізнесмена правапарушальнікам і згодна нададзеных паўнамоцтваў падаткоўцы за некалькі гадзін арыштавалі 13 ягоных таксовак, пазбавіўшы пры гэтым працы паўсотні чалавек. Аб нязручнасцях, з якімі сутыкнуліся патэнцыйныя пасажыры казаць, пэўна, і не варта.

Такія адносіны і падштурхнулі прадпрымальніка і ягоных работнікаў да рашучай акцыі пратэсту. Трэба нагадаць, што самыя галадоўкі ў сучаснай гісторыі Беларусі мелі месца неаднаразова. Хоць і не з'яўляюцца яны масавай з'явай. Так, ужо больш за дваццаць дзён галадуе жанчына ў Бабруйску, патрабуючы сустрэчы з А. Лукашэнкам дзеля вырашэння сваіх сацыяльна-бытавых праблем. Да апошняга часу рабіла яна гэта разам з такой жа сяброўкай, але тая з-за пагаршэння здароўя спыніла галадоўку. Абвяшчалі галадоўкі і дэпутаты Вярхоўнага Савета ў 1995 годзе супраць рэферэндуму, які тычыўся надання рускай мове статусу дзяржаўнай і вяртання мадэрнізаваных савецкіх сімвалаў замест нацыянальных. Акцыя была спынена, калі галадуючых літаральна павыкідвалі з залы пасяджэнняў спецыялізаваныя міліцэйскія падраздзяленні. Звычайна галадуюць затрыманыя і арыштаваныя ўдзельнікі розных апазіцыйных мітынгаў і пікетаў, спыняючы такую форму пратэсту з выхадам з-за кратаў. Варта заўважыць, што галадоўкі ў Беларусі часцяком з'яўляюцца выбухам эмоцый.

Ваўкавыская ж галадоўка сумленна працуючых людзей выклікана абсалютным свавольствам уладутрымаючых і вызначаецца надзвычайнай салідарнасцю. У гэтым яе асаблівасць. Што пераможа — вера ў сваю правату ці разуменне непераходзячай каштоўнасці ўласнага здароўя? Сярод галадуючых ужо ёсць ахвяры — з-за пагаршэння самаадчування двое чалавек былі шпіталізаваныя.

Цяжка прадбачыць чым скончыцца канфлікт. Падаецца, што самае галоўнае, каб галадуючыя, сярод якіх ёсць і жанчыны, засталіся жывымі і здаровымі, і, нарэшце, зразумелі, што змагацца за свае правы можна толькі аб'яднаўшыся ў арганізацыю, якая будзе мусіць гэта рабіць на больш-менш прафесійным узроўні. І галадоўкі ў такім выпадку акажуцца папросту непатрэбнымі.

Як кажуць у народзе, пакуль гром не грымне, мужык не перахрысціцца. Ваўкавыскія галадоўшчыкі стварылі першасную суполку прадпрымальніцкага прафсаюза „Садружнасць". Лепш позней, чым ніколі.

Уладзімір Лапцэвіч

Спяваю з дзяцінства

[1 ☞ працяг]

— Зараз у цябе многа рэпетыцый і выездаў. Ці маеш час на навуку?

— З вучобай атрымліваецца добра. Для мяне цяпер самыя важныя экзамены на атэстат сталасці і паступленне ў вышэйшую ўстанову. Не лічу, што спяванне стане галоўным заняткам у маім жыцці.

— Куды будзеш паступаць?

— Здаўна я хацела працаваць у сродках масавай інфармацыі як журналіст-фотарэпарцёр — у газеце або на тэлебачанні. Таму хачу паступаць на журналістыку.

— Чым цікавішся апрача спявання?

— Ужо доўга фатаграфую (Маргарыта дабівалася поспехаў у агульнапольскіх конкурсах, а ў Гайнаўцы арганізаваліся выстаўкі яе фатаграфій — А. М.). Займаюся валейболам. Цікавяць мяне фальклор і размовы са старэйшымі людзьмі.

— Што хочаш перадаць нашым чытачам?

— Дзякую ўсім, хто галасаваў на мяне, настаўніцы Бажэне Ляўчук і іншым асобам, якія дапамагалі ў падрыхтоўцы да выступленняў.

— Дзякую за размову.

Гутарыў Аляксей Мароз

Пад знакам Камоцкага і Вайцюшкевіча

Фота ЗОСІ ЛЕМЕШ

Бельск: дзікі танец пад сцэнай

[1 ☞ працяг]

спасцярозе трапнага ёсць. У першай пяцігодцы былі адзначаны ўсе аксакалы беларускай аўтарскай песні. Пазнейшых лаўрэатаў фестывалю, думаю, не памятаюць найбольшыя заўзятары гэтага жанру музыкі, песні. Адно, што пасля іх засталося, — пяшчотная назва: „мяўкалы".

Фота ЗОСІ ЛЕМЕШ

Лявон Вольскі

Таму цешыць, што арганізатары скарысталі юбілей дзеля элімінацыі таго, што апошнімі гадамі выразна кульгала — конкурсу. Іншая станоўчая змена такая, што „Бардаўская восень" упершыню сёлета выйшла за гасцінны парог Бельскага дома культуры. Фестываль пачаўся канцэртам *live* у Беластоцкім радыё, а закончыўся ў Гайнаўцы. Але, безумоўна, найважнейшы і найлепшы канцэрт прайшоў у Бельску.

Два таленты

Падзеяй фестывалю была прэм'ера альбома „Паравіны году" гурту „WZ-Orkiestra". Лідэр гурту Зміцер Вайцюшкевіч напісаў музыку да вершаў Алеся Камоцкага.

Вайцюшкевіч запрапанаваў арыгінальнае прачытанне простых слоў, няспешных, лірычных радкоў пра чалавека, які „запавольвае хаду" і дзякуючы таму заўважае такія звычайныя з'явы як: снег, дождж, сад у квецені, дзяўчыну, што чакае першага кахання. Жанр гэтай музыкі цяжка вызначыць, але ён недалёкі ад таго, як сваё выступленне назваў Лявон Вольскі: *piosenka kabaretowa*.

Зміцер Вайцюшкевіч добра вядомы ў нас як саліст гуртоў „Палац" і „Krivi". Іграў першапланавыя ролі ў праектах: „Народны альбом" і „Я нарадзіўся тут", выступаў з аўтарскімі праектамі „Цацачная крама" на словы Леаніда Дранько-Майсюка і „Балады". Алесь Камоцкі кажа, што сцэнічны варыянт „Паравін году", гэта выключна заслуга Вайцюшкевіча:

— Я напісаў словы і ўсё. Мая роля ў праекце больш-менш такая, як баяна Аляксандра Шувалава, — называе аднаго з сяброў гурту.

Баян Шувалава, аднак, у праекце вельмі важны. Як і скрыпка Ксені Мінчанкі, гітара Алега Івановіча, бас-гітара Вячаслава Сяргеенкі і акустычныя бубны Юрася Мартынава (на дыску інструментарый яшчэ багацейшы). Словы таксама не малаістотныя. Пра супольны плён Алеся Камоцкага і Зміцера Вайцюшкевіча Рыгор Барадулін напісаў: „два таленты ўжо да амаль геніяльнасці блізяцца".

Вялікія адсутныя

Галоўны канцэрт фестывалю доўжыўся чатыры гадзіны, але наўрад ці былі ахвотныя пакінуць залу Бельскага дома культуры перад канцом. Пачынаў, як штогод, лірычна пад гітару Алесь Камоцкі. Яму на змену выйшаў дынамічны бумбамлітавец (ад літаратурнага аб'яднання Бум-бам-літ) Сяржук Мінскевіч, а першую частку канцэрта завяршыла „WZ-Orkiestra". Другая частка, гэта: патрыятычна-іранічны Андрэй Мельнікаў, усё больш лірычны Віктар Шалкевіч ды ідал маладой Беласточчыны Лявон Вольскі. Гэты апошні пад акустычную гітару, з дапамогай срыпкі і баяна, праспяваў „выбранае" з „Крамбамбулі", „Народнага альбома", „Я нарадзіўся тут". Несмяротныя „Тры чарапахі" гурту „NRM" паднялі бельскіх і гайнаўскіх ліцэістаў з месцаў. Канцэрт закончыўся танцамі пад сцэнай.

У час гэтае рэтраспекцыі ўсё-ткі забракавала некалькіх асоб. Калі казаць пра ўдзельнікаў фестывалю, дык безумоўна Касі Камоцкай. Не толькі таму, што без яе вобраз сучаснай беларускай паэтычнай песні — няпоўны. Але таксама таму, што дзякуючы ёй публіка „Бардаўскай восені" перажыла не адну цёплую хвіліну.

Фота ЗОСІ ЛЕМЕШ

Алесь Камоцкі

Юрка Асеннік у мінулым і спяваў на „Бардаўскай восені", і, як старшыня Звязу беларускай моладзі, арганізаваў фестываль. А яго заўсёды дапрацаваныя плакаты адзначаліся арыгінальнасцю, да якой цяперашнім далёка.

Лявон Тарасэвіч у пачатках фестывалю быў бясспрэчным гуру яго арганізатараў. Фундаваў узнагароды. „Залатога Ваську" і сёння цёпла ўспамінаюць не толькі лаўрэаты гэтай прэміі. У апошніх гадах, аднак, ні гэтай узнагароды, ні самога яе аўтара на фестывалі не відно.

Неяк атрымалася хаўтурна. Прашу прабачэння. Гэтыя ж людзі жывуць і, пэўна, маюцца добра. Чаго жадаю і арганізатарам „Бардаўскай восені" — аднае з нешматлікіх у нас культуратваральных імпрэз. Хай з году ў год становіцца ўсё лепшай.

Мікола Ваўранюк

Віцебская трупа ў Гайнаўцы

Нацыянальны акадэмічны тэатр імя Якуба Коласа з Віцебска 13 кастрычніка выступіў у Комплексе школ з дадатковым навучаннем беларускай мовы ў Гайнаўцы з монаспектаклем. Беларускія госці вярталіся з Міжнароднага фестывалю „Дыялог" у Вроцлаве.

Монаспектакль пачаўся з вершаў і народных беларускіх песень. Адзін акцёр патрапіў прыцягнуць увагу вучняў. Дапамагло яму ў гэтым цікавае сцэнічнае афармленне з прымяненнем школьнай мэблі і прынесеных з панадворка дошак. Ліцэісты хваляваліся за герояў — Янука і Гражыну, каханне якіх раздзяліла смерць. Свята Купалля, апісанае на падставе гродзенскіх святкаванняў, белліцэісты маглі параўнаць з абрадамі Гайнаўшчыны.

Вучням спадабалася выступленне Пятра Ламана, вядомага акцёра і пісьменніка. Монаспектакль ставіўся на падставе яго аповесці „Радзіма Душы" са зборніка „Астравы". Падзеі ў аповесці адбываюцца ў наваколлі Гродна, адкуль выводзіцца акцёр. Двух падарожнікаў трапіла ў Каложскую царкву. Сустрэлі там дзядзьку, які касіў траву. Расказаў ён незнаёмым пра стварэнне храма і гэтая гісторыя стала матывам монаспектакля.

— Ад маці ведаю як калісь людзі жылі на вёсцы. У монаспектаклі выкарыстаў я матчыны народныя песні, — сказаў Пётр Ламан.

Пётр Ламан перад ліцэістамі дэкламаваў свае вершы. Выдаў ён тры паэтычныя зборнікі: „Споведзь агню", „Стары млын" і „Зерне імгненняў". Піша на беларускай мове. Некаторыя творы былі перакладзены на рускую мову. Сам пераклаў з польскай на беларускую мову „Мужа і жонку" Аляксандра Фрэдры. Акцёр і паэт з'яўляецца членам Саюза беларускіх пісьменнікаў і Міжнароднай асацыяцыі пісьменнікаў ПЭН-цэнтр.

— Хаця выступаем толькі на беларускай мове, публіка не падводзіць і асаблівых правалаў не было. Трымаем высокі ўзровень, а нашы акцёры не распранаюцца на сцэне, каб прыцягнуць гледачоў. У Полацку на „Чорнай даме Нясвіжа" ў нас была большая публіка, чым у выступаючага тады маскоўскага тэатра, — кажа Пётр Ламан.

Фота АЛЯКСЕЯ МАРОЗА

Белліцэістам спадабалася ігра Пятра Ламана

Віцебскі Нацыянальны акадэмічны тэатр імя Якуба Коласа дзейнічае з 1926 года. У тэатры занятых 56 акцёраў. Выступалі яны з пастаноўкамі ў Расіі, Літве, Германіі і Францыі. Тэатр атрымліваў прэстыжныя ўзнагароды. Некалькі гадоў таму ў Эдынбургу (Шатландыя) за пастаноўку „Запіскаў вар'ята" Мікалая Гогаля акцёры заваявалі Гран-пры. У віцебскім тэатры дзве сцэны: вялікая і камерная. Акцёры апошняй часцей выязджаюць за мяжу, бо для меншай групы лягчэй сабраць сродкі на паездку. Апошнім часам у тэатры ставіліся: „Стрэл у тумане" Васіля Быкава, „Сон на кургане" Янкі Купалы, „Новая зямля" Якуба Коласа і „Жанчына ў пясках" Абэ Кобэ.

— Нам падабаецца беларуская публіка Беласточчыны. Выступалі мы ўжо ў Гайнаўскім доме культуры і ў Крынках. Будзем намагацца прыязджаць у Польшчу, але складана знайсці дзеля гэтага спонсараў, — кажа рэжысёр Юрый Лізінгевіч. Многа гадоў працаваў ён дырэктарам тэатра, а зараз выступае як акцёр. Трэцяй асобай у віцебскай трупе, якая прыехала ў Гайнаўку, быў кампазітар Аляксандр Крыштаповіч. У монаспектаклі адказваў ён за музыку.

Аляксей Мароз

Канцлагер у Картуз-Бярозе

Нядаўна выйшла друкам манаграфічнае апрацаванне маладога гісторыка Беластоцкага універсітэта Войцеха Сляшынскага, прысвечанае канцлагеру ў Картуз-Бярозе*. Гэтая ўстанова, створаная санацыйнымі ўладамі ў 1934 г., упамінаецца ва ўсіх падручніках па гісторыі, але большасць літаратуры на гэтую тэму паказвае яе як турму з абвостраным рэжымам. Прабывала там таксама некалькі соцень дзеячаў беларускіх дэмакратычных арганізацый і беларусаў, абвінавачаных у камуністычнай дзейнасці.

Сляшынскі пісаў працу на аснове малавядомых дакументаў, знойдзеных ім у Брэсцкім абласным архіве. Абшырныя іх фрагменты паказваюць умовы жыцця зняволеных і брутальнасць паліцыйных службаў. Канцлагер быў арганізаваны паводле савецкіх і нямецкіх узораў. Логіка яго стварэння заключалася ў ізаляванні палітычных ворагаў санацыі, а таксама ўсіх падазроных, якім цяжка было даказаць якую-небудзь віну. Згодна распараджэнню прэзідэнта Рэчы Паспалітай ад 17 чэрвеня 1934 г., падпісаным таксама членамі ўрада, паліцыя магла арыштаваць кожнага, каго падазравала ў парушэнні публічнага парадку і саслаць у Картуз-Бярозу на тры месяцы. Час зняволення маглі прадаўжаць яшчэ некалькі разоў, калі камендант канцлагера лічыў, што зняволены пасля трохмесячных здзекаў можа надалей прадаўжаць сваю дзейнасць. Першым камендантам стаў Вацлаў Костэк-Бярнацкі, вядомы як садыст яшчэ з часу I сусветнай вайны.

У Картуз-Бярозу санацыя пасылала украінскіх і беларускіх дзеячаў, членаў апазіцыйных польскіх партый, камуністаў, спекулянтаў і крымінальнікаў. Апошняя катэгорыя зняволеных часта выкарыстоўвалася паліцыяй у праследаванні палітзняволеных. Крымінальнікі выконвалі функцыі інфарматараў, назначаліся дзяжурнымі, мелі права беспакарана біць палітычных. Арыштаваныя ўваходзілі на тэрыторыю канцлагера паміж двума радамі паліцыянтаў з гумовымі дубінкамі, якія катаваннем віталі свае ахвяры. Першыя дні зняволеныя стаялі тварам да сцяны ў бараку, спаць можна было толькі на бетоннай падлозе. За парушэнне загаду маўчання ці неадпаведны адказ паліцыянту чакала катаванне.

Побач канцлагера жылі паліцыянты са сваімі сем'ямі. Пасля цяжкага дня садыстычных здзекаў адпачывалі ў акружэнні жонак і дзяцей. Часам брутальнасць паліцыі вяла да смерці зняволеных, але найчасцей, калі некага падазравалі, што можа памерці, адсылалі дадому ці ў шпіталь. Такім чынам стастыстыка паказвала невялікую колькасць ахвяр брутальнасці дзяржаўных функцыянераў.

Дакументы, прыведзеныя Сляшынскім, выяўляюць запланаваную сістэму фізічнага і псіхічнага праследу. Некалькі секундаў мелі зняволеныя каб пакарыстацца туалетам, некалькі мінут каб паабедаць. Забаронена было хадзіць, трэба было перамяшчацца подбегам. Забаронена было размаўляць і смяяцца. Дазвалялася гаварыць шэптам і толькі ў нядзелю. За парушэнне рэгламенту чакалі жахлівыя пакаранні. Вартавыя звярталіся да сваіх падапечных словамі „ты, скурвысыне".

Спачатку абсалютную большасць турэмшчыкаў састаўлялі палітзняволеныя, ад 1938 г. улады да амаль 50 працэнтаў пабольшылі лік крымінальнікаў, што жыццё першай катэгорыі вязняў учыніла кашмарным. У 1934-1937 гадах больш за 70 працэнтаў зняволеных абвінавачваліся ў прыхільнасці да камунізму. Сярод „камуністаў" найбольш было беларусаў і яўрэяў. У гэты перыяд каля 20 працэнтаў прабываючых за дратамі ў Картуз-Бярозе састаўлялі украінскія нацыянальныя дзеячы і 10 працэнтаў — польскія. З 1 верасня 1939 г. у Картуз-Бярозу накіравалі некалькі тысяч грамадзян Польшчы падазроных у спрыянні Нямеччыне. Не хапала харчоў для раптоўна пабольшанай колькасці зняволеных. Ноччу з 17 на 18 верасня 1939 г. паліцыянты, якія пільнавалі зняволеных, пакінулі канцлагер. Наступнага дня Картуз-Бярозу заняла Чырвоная Армія.

Яўген Міранові́ч

*W. Śleszyński, *Obóz odosobnienia w Berezie Kartuskiej 1934-1939*, Białystok 2003, ss. 152.

Незакончаныя сустрэчы

Адгалоскі

У 38 нумары „Нівы" ад 21.09.2003 г. друкаваўся допіс М. Панфілюка „Незакончаная сустрэча", у якім аўтар дзяліўся ўражаннямі ад сустрэчы з Міхасём Куптэлем. З гэтым чалавекам і я меў нагоду сустрэцца ў жніўні г.г. у памяшканні Беларускага самаўрадавага форуму. Сябра з Дубіч-Царкоўных з болем прыкмячае, што ягоныя ўспаміны залежваліся ад лютага і толькі нядаўна друкаваліся. А мае ад лістапада мінулага года чакаюць сваёй чаргі. Рэдактар гаварыў неаднойчы: „Успаміны заўсёды актуальныя". Я з гэтым пагаджаюся таксама, як і з высновай сябры Панфілюка, што ў „Ніву" трэба пісаць. І не толькі пасылаць успаміны. Аб буднях штодзённага жыцця трэба пісаць. Аб радасцях (якіх зараз надта мала на вёсках), і аб праблемах, якія бударажаць лакальную грамадскасць. Нам, шматгадовым супрацоўнікам „Нівы", нельга спыняць карэспандэнцкую дзейнасць толькі таму, што камусьці не падабаюцца нашы крытычныя допісы.

Аўтар шкадуецца, што Міхась Куптэль не з'явіўся паўторна ў ягонай хаце 17 жніўня. Я таксама мог бы зрабіць закід госцю з Узбярэжжа, што не адгукнуўся перад ад'ездам з Махнатага. І дзеячам БСФ у Гайнаўцы таксама, з якімі дамаўляўся на сустрэчу 21 жніўня ў Чаромсе (на гэту тэму правёў я размовы з дырэктарамі школы і гімназіі). У кожнага ёсць праблемы і „важнейшыя" справы. Таму лічу, што М. Андрасюк з М. Голубам неўзабаве адгукнуцца і прыедуць у Чаромху, каб рашыць справы, аб якіх гаварылі мы ў час першай сустрэчы. Гэта будзе карысным дзеля супольнай беларускай справы.

Уладзімір Сідарук

Вачыма паляка

Яксьці там будзе?

Выслухаў я выступленне ў Сейме віцэ-міністра замежных спраў Анджэя Залуцкага, які апраўдваўся з працы консульскіх і дыпламатычных прадстаўніцтваў у Расіі, Беларусі і Украіне наконт выдавання віз. Насуперак тыповым думкам, асабліва немалых груп асоб чакаючых у чэргах, спадар віцэ-міністр аптымістычна інфармаваў аб тым, аб чым уголас гаварылі яго начальнікі яшчэ перад 1 кастрычніка, а нават да 1 верасня, значыць, дня, калі рушыла выдаванне віз.

— Праца нашых устаноў — добра падрыхтаваная для выдавання віз.

Польскіх дэпутатаў менш нават цікавіў доўгі час чакання, а падзенне прыгранічнага гандлю на г.зв. Усходняй сцяне. Віцэ-міністр зазначыў прытым, што чэргі станавіліся перш за ўсё да аконцаў, дзе давалася інфармацыя. Іншае вынікае з назірання сведкаў, хоць бы са справаздачы з-пад польскага консульства ў Гродне Міколы Ваўранюка ў 43 нумары „Нівы". Ведаю будынак гродзенскага консульства і нават пры пабольшанні ліку персаналу, у чым я ўпэўнены, не будзе гэта мець значэння ў паскарэнні абслугі кліентаў. На суцяшэнне (?) — яшчэ горш у Львове. У час сеймавай дэбаты віцэ-міністр, аднак, супакойваў, што сітуацыя да 1 кастрычніка на працягу пару месяцаў вернецца да тае, якая была раней.

— Большасць віз, таксама выдаваных у Беларусі — шматразовыя, — супакойваў.

З даных, якімі распараджаюцца МЗС у Варшаве і Памежная страж, вынікае, што толькі да паловы кастрычніка былі выдадзены 32 тысячы віз беларусам, параўнальна ўкраінцам — 23 тысячы і расіянам — 13 тысяч. За звыш двухтыднёвы перыяд ад іх увядзення мяжу Польшчы перасякло на 77 працэнтаў больш грамадзян Беларусі, Украіны і Расіі. Калі верыць гэтым даным, пакуль такая тэндэнцыя можа ўтрымацца. Пасля, пэўна, панізіцца, бо тыя, хто атрымаў шматразовыя візы, не будуць за іх старацца.

І фактычна, з маіх назіранняў за турыстычна-гандлёвым рухам на беластоцкім базары па вул. Юравецкай вынікае, што штосьці „дрыгнула". Тройка з даўно бачаных мною каля стаянкі таксі беларусаў ужо там прастойвае. Іншыя маюць вярнуцца ў снежні перад каталіцкім Ражджаством ды раней — „Мікалайкамі". Згодна са здагадкамі, зараз пасля 1 кастрычніка цэны цыгарэт „скочылі" з 2,50 да 2,70 зл., а нават некалькі дзён і да 3 злотых. З часам вярнуліся да 2,70 зл., а маюць вярнуцца, згодна з абяцанкамі прадаўцоў — да цаны з „давізавага" часу. Дарэчы, заўсёды можна патаргавацца. Усё ж гэта — „свабодны рынак".

Значыць, як аказваецца, памаленьку — „яксьці там будзе". Дурнавата неяк на замяшанні ва ўвядзенні візаў паказаліся некаторыя палітыкі, хоць бы мясцовыя. Адзін з іх — былы падляшскі маршалак Славамір Згжыва (Грамадзянская платформа — РО), які, стараючыся за сенатарскі мандат, збіраў подпісы пад петыцыяй увесці бясплатныя візы для беларусаў. Здавалася, што за гэтай ідэяй стаяць таксама падтрымліваючыя яго першапланавыя палітыкі РО, якія гасцявалі ў рамках яго кампаніі ў нашым рэгіёне — Дональд Туск, Мацей Плажынскі ці Ян Мар'я Ракіта. І хоць цяжка было б уявіць рэалізацыю такога праекта, нейкая колькасць подпісаў была сабрана. Ну і што? А нічога. Што пасля з імі сталася, невядома. Славамір Згжыва праваліўся на выбарах. І можна забыцца на візавыя пытанні, а пэўна і іншыя вынікаючыя з ягонага г.зв. грамадзянскага клопату. Дарэчы, кароткая памяць — рыса, характэрная свету палітыкі.

Мацей Халадоўскі

Што (каго) ахоўваюць?

У структурах дзяржаўнай чыгункі дзейнічаюць суполкі паасобных службаў. Адной з іх з'яўляецца Служба аховы чыгункі (SOK). Як самая назва паказвае, працаўнікі фірмы займаюцца аховай чыгуначнай маёмасці. У мінулым, як квітнеў міжнародны гандаль Усход — Захад, дык „сакісты" ахоўвалі цягнікі, у якіх перавозіўся каштоўны тавар. Пасля заняпаду транзітнага руху і абмежавання ўнутранага гандлю (перавозчыкі перакінуліся на таннейшы, аўтамабільны транспарт), дык абмежавалася і задача ахоўнікаў СОКу. Чым тады займаюцца? Вось што прыкмеціў я на станцыі ў Беластоку.

12 кастрычніка (нядзеля) падарожнічаў я ў Чаромху. Цягнік у 8^{45} паставілі ў пероны ў 7^{15}. Калі я падаўся ў апошняе купэ задняга вагона, дык прыкмеціў чатырох сакістаў у паласатай уніформе і жоўтых жылетках з надпісам „Służba Ochrony Kolei".

— Вось як нясуць службу, — загаварыў адзін з пасажыраў. — У вагонах хаваюцца замест пільнаваць парадку на перонах. У час патрэбы (пакражаў ці бойкі на вакзале) ніводнага не прыкмеціш. Яны бачаць адно тых, хто папяросу ў вагоне закурыць ці піва вып'е. Штрафам пагражаюць. Не адмолішся ад нахабнікаў.

Да сядзеўшых у вагоне далучыліся яшчэ трох з перона. У такой кампаніі прасядзелі больш за гадзіну (чатырох першых у жылетах прыехалі са стаянкі). Колькі затым затрацілі на вясёлай балбатні, цяжка сказаць. Здзіўляе мяне факт, што ўсё гэта праходзіла перад акном каменданта змены, кантора якога змяшчаецца на пероне. Прыпомніўся мне рускі анекдот, які неаднойчы чуў я ад савецкіх афіцэраў, з якімі калісь штодзень сустракаўся ў працы на чыгуначнай станцыі: „Солдат спит — служба идёт". (ус)

Самакіраванне па-над межамі

Трэцяя стажыроўка дэпутатаў мясцовых саветаў і прадстаўнікоў няўрадавых арганізацый з Беларусі, якая адбылася з 23 па 26 кастрычніка на Гайнаўшчыне, праходзіла пад агульным лозунгам „Польшча — Беларусь. Самакіраванне па-над межамі".

— Наладжваючы мерапрыемства на першым месцы паставілі мы абмен вопытам. Пакажам беларускім гасцям як працуюць нашы самаўрады, чыноўнікі і як паўстаюць нізавыя ініцыятывы. Ці наш вопыт можна будзе выкарыстаць у Беларусі, нашы госці вырашаць самі, — сказаў Міхась Андрасюк, старшыня Беларускага самаўрадавага форуму ў Гайнаўцы, арганізатар мерапрыемства. — Радныя Гайнаўшчыны пры нагодзе пазнаёміліся з формамі самакіравання ў Беларусі, а госці — з жыццём беларусаў Беласточчыны.

— Хочам адукаваць нашых дзеячаў, каб пасля пераменаў у нашай краіне не пачыналі мы працы з першых крокаў, — гаворыць Аляксандр Жучкоў, старшыня праўлення Фонду імя Льва Сапегі з Мінска.

Удзельнікі стажыроўкі прысутнічалі на сесіі Рады Белавежскай гміны і спаткаліся з войтам Аннай Байко. Наведалі Дырэктыйны парк і прыватны скансэн каля Белавежы. Госці з Беларусі цікавіліся пытаннямі сацыяльнай дапамогі і з гэтай мэтай наведалі ў Белавежы дом сацыяльнай дапамогі „Ракітнік", а ў Гайнаўцы — Гарадскі асяродак сацыяльнай дапамогі, Павятовы цэнтр дапамогі сям'і і Дом самадапамогі. Беларускіх дэпутатаў найбольш уразіла самадзейнасць жыхароў Дома самадапамогі, якія шчыра і займальна выступілі з беларускімі песнямі „Беларусачка" і „Аксамітны летні вечар".

Фота АЛЯКСЕЯ МАРОЗА

Удзельнікі стажыроўкі

— У нас не сустрэнеш такіх як у Гайнаўцы ўмоў для абяздоленых, — адзначыў Віталь Броўка з Цэнтра развіцця рэгіянальнай актыўнасці ў Сянно (Віцебшчына).

— Палітычная і гаспадарчая трансфармацыі спрычыняюцца да росту беспрацоўя і павелічэння колькасці наведнікаў асяродкаў сацыяльнай дапамогі. Таму многа ўвагі адвялі мы, каб паказаць існуючую ў нас сетку сацыяльных устаноў, — кажа Міхась Андрасюк.

Арганізатары прапанавалі гасцям цыкл дакладаў пра дзейнасць няўрадавых арганізацый і самаўрадаў у Польшчы. Дырэктар Цэнтра грамадзянскай адукацыі Польшча-Беларусь Яўген Вапа паінфармаваў аб дзейнасці беларускіх суполак у Польшчы.

У складзе дэлегацыі было двое настаўнікаў. Іх найбольш зацікавіў візіт у Комплексе школ з дадатковым навучаннем беларускай мовы ў Гайнаўцы. Госці запрасілі моладзь наведаць Беларусь.

— Многія ліцэісты яшчэ не былі ў нашай краіне і не ведаюць сапраўднай Беларусі. Мы хочам пазнаёміць моладзь беларускага ліцэя з нашымі вучнямі. Прадбачвем, што вясной ліцэісты з Гайнаўкі наведаюць нас, — лічыць настаўніца біялогіі Вольга Ахрук з Гродзенскага аддзялення Фонду імя Льва Сапегі. У Гродне зараз няма беларускіх школ, а толькі беларускія класы. Беларускамоўная моладзь гуртуецца ў нефармальных групах і гуртках зацікаўленняў.

Андрэй Аляхновіч з Аб'яднання беларускіх скаўтаў з Крупак (Міншчына) запросіць вучняў беларускага ліцэя і настаўніка гісторыі Яўгена Янчука на археалагічныя раскопкі гарадзішча каля Крупак. Археолагі працуюць там ад 1999 года. Ужо знойдзены прадметы VII стагоддзя.

Беларускія госці наведалі ў Гайнаўцы Музей і асяродак беларускай культуры і Свята-Троіцкі сабор. Пабывалі таксама на фестывалі „Бардаўская восень" у Бельску-Падляшскім. Уразіла іх вялікая колькасць моладзі, якая прыйшла слухаць беларускія песні.

Аляксей Мароз

Як пісаць пра культуру?

Менавіта гэтай праблеме была прысвечана дыскусія варшаўскіх і гродзенскіх журналістаў, што прайшла 25 кастрычніка ў Галоўнай сядзібе Саюза палякаў Беларусі па ініцыятыве Інстытута польскага і Пасольства Рэспублікі Польшча ў Беларусі.

Па словах кіраўніка варшаўскай дэлегацыі — супрацоўніка інфармацыйнага агенцтва ПАП Славаміра Стэльмаха, такія сустрэчы паміж інтэлектуаламі Польшчы і Беларусі, дзякуючы Інстытуту польскаму ў Мінску, фонду „Dobro lokalne" ды Польскаму пасольству, маюць стацца традыцыйнымі і будуць прысвечаны самай разнастайнай праблематыцы. На думку Славаміра Стэльмаха, тэма першай дыскусіі — асвятленне культурніцкіх падзей у медыях — была выбрана невыпадкова, бо гэтае пытанне ва ўмовах татальнай камерцыялізацыі мастацтва актуальнае не толькі для творцаў Польшчы ці Беларусі, але і для шырокай грамадскасці, якую журналісты часам дрэнна інфармуюць. Больш за тое, нярэдка прадстаўнікі медыяў, не разбіраючыся ў асобных відах мастацтва, робяць няправільныя акцэнты і выносяць неадэкватны самой падзеі ўласны вердыкт.

Пра гэта больш падрабязна распавёў намеснік дырэктара Інстытута гісторыі мастацтва Варшаўскага універсітэта прафесар Вальдэмар Баранеўскі, акцэнтаваўшы ўвагу на некаторых спецыфічных аспектах існавання і разумення сучаснага мастацтва. І ў гэтай справе вельмі важную і адказную задачу маюць выконваць якраз журналісты і прафесійныя крытыкі.

— Крытык — гэта сааўтар мастацкага твора, бо выступае пасрэднікам паміж творцам і спажыўцом мастацтва, — падсумаваў сваю міні-лекцыю прафесар Вальдэмар Баранеўскі. — Ён валодае тэхнікай інтэрпрэтацыі і перакладае твор на зразумелую для шырокай грамадскасці мову...

Каб быць пачутым ды прыцягнуць да сваёй асобы ўвагу публікі ва ўмовах татальнага дамінавання мас-медыяў і сацэльнай камерцыялізацыі, некаторыя творцы адмыслова ідуць на скандал, парушаючы пры гэтым агульнапрынятыя нормы паводзінаў ці маралі. Пра скандал, які выбухнуў вакол польскай мастачкі Дароты Нязнальскай (намалявала мужчынскія геніталіі на крыжы — аўтар) ды іншыя эксцэсы на рынку мастацтва распавёў журналіст Польскага радыё Міхал Гаеўскі. А паэт і выдавец з мястэчка Голдап Міраслаў Слапік падараваў прысутным свой новы зборнік вершаў...

Шкада, што ў дыскусіі прынялі ўдзел прадстаўнікі толькі двух (акрамя вэб-сайта „Пагоні") мясцовых выданняў: газеты Саюза палякаў Беларусі „Głos znad Niemna" і каталіцкага тыднёвіка „Слова жыцця". Госці з Польшчы жадалі пачуць думку журналістаў іншых гродзенскіх СМІ, бо іх цікавіла чым адрозніваецца асвятленне найбольш значных грамадскіх і культурніцкіх падзей у дзяржаўных і прыватных выданнях на Гродзеншчыне.

Вельмі дзіўным падалося падчас дыскусіі запэўніванне журналіста „Głosu znad Niemna" Аляксандра Бяззубава, што ў гродзенскіх газетах няма цэнзуры, у прыватнасці ў ягоным выданні і аблвыканкамаўска-гарвыканкамаўскай „Гродзенскай праўдзе".

— Афіцыйна пра цэнзуру ў Беларусі не гаворыцца, але і дурню зразумела, што яна насамрэч існуе, прычым не толькі ў дзяржаўных выданнях, — запярэчыў сябра Беларускага ПЭН-цэнтра Юры Гумянюк. — Мне часта даводзіцца пісаць пра падзеі ды праблемы беларускай культуры, якія так ці інакш залежаць ад сацыяльна-палітычнай сітуацыі ў Беларусі. Але свае артыкулы і нарысы я друкую ў беластоцкім месячніку „Czasopis" і штотыднёвіку „Ніва", бо на сто працэнтаў упэўнены, што ў мясцовых „Вячэрнім Гродне" ці „Гродзенскай праўдзе" існуе ідэалагічная цэнзура!

Як паказала практыка, асобныя артыкулы цэнзуруюцца і ў газеце СПБ „Głos znad Niemna". Прычым экспертам тых матэрыялаў „на прадмет апазіцыйнасці да ўлады" выступаў сам... старшыня СПБ Тадэвуш Кручкоўскі! Нязгодныя з ягонымі дзеяннямі журналісты былі вымушаны звольніцца.

— Першым сімптомам стала забарона панам Кручкоўскім публікацыі рэйтынгу кандыдатаў у прэзідэнты Беларусі ў 2001 годзе, які мы праводзілі сярод чытачоў „Głosu", — гаворыць карэспандэнт „Rzeczpospolitej" Анджэй Пісальнік. — У пэўны момант я зразумеў, што газета Саюза палякаў Беларусі сапраўды цэнзуруецца і звольніўся з „Głosu"...

Занепакоеныя кепскай сітуацыяй са свабодай слова ў Беларусі і катастрофай, якая спасцігла беларускую мову і культуру пасля лукашэнкаўскіх рэферэндумаў, польскія журналісты паабяцалі часцей наведвацца ў госці і пажадалі сваім гродзенскім калегам мужнасці і аб'ектыўнасці ў асвятленні найбольш значных грамадскіх і культурніцкіх падзей свайго краю.

Вацлаў Галімскі

Праблемы адной вёскі

За чыгуначным пераездам на лініі Чаромха — Седльцы ў левы бок адыходзіць дарога. Ніякага пры ёй паказальніка. Праехаўшы кусочак прыкмеціў забудовы. Затым табліцу з надпісам „Połowce".

— Чаму няма паказальніка пры дарозе ад шашы? — пытаю солтыса Віктара Сцепанюка.

— Ад Ставішчаў ёсць, — адказвае гаспадар вёскі. — Мабыць, і з боку дарожнага перахода павінен такі знак быць.

— Гэта віна гміны, — уключаецца ў размову Пятро Сцепанюк. — Табліцу з назвай вёскі прывезлі адно ў верасні гэтага года. Раней „рускія" неаднойчы пыталі ўвечары што гэта за вёска, як блудзілі па наваколлі.

Але не адна гэта праблема невялічкай прыгранічнай вёсачкі.

— Каля крыжа, на ўзгорку, знаходзіцца круты паварот. Ніякага там дарожнага знака. Пагражае гэта выпадкам, гаварыў я аб гэтым на сесіі Рады гміны ў Чаромсе, — канстатуе солтыс, — але без выніку.

— Ехаў я аднойчы на трактары, — кажа Пятро Сцепанюк. — З процілеглага боку ад шашы гнаўся „рускі" на аўтамабілі. Ледзь ускочыў убок, бо вуліца тут вузенькая. Не ўяўляю што магло б здарыцца.

— І яшчэ вось што скажу, — прадаўжаў малодшы Сцепанюк. — Ёсць у аднаго гаспадара велізарны сабака. Часта выбягае ён на вуліцу. Аднойчы нехта прыстрэліў яго, як блукаўся ў пагранічнай паласе. Гаспадар падаў заяву пагранічнікам. Вайскоўцы на службовым аўтамабілі ў Кляшчэлі да ветэрынара вазілі. Я б такога гаспадара штрафам аблажыў за тое, што без догляду пускае на вуліцу сабаку.

Мае суразмоўцы быццам пабойваліся паслядоўнасці з боку гаспадара, таму не назвалі яго прозвішча.

— Такі з паліцыяй і пагранічнай стражай у згодзе жыве, — завяршылі размову Сцепанюкі. — Бог ведае, што можа чалавеку здарыцца.

Уладзімір Сідарук

Зорка

старонка для дзяцей

Артур Вольскі

Асенняе

Ні ціха,
ні шпарка
плыла сабе хмарка.
Плыла
невядома
адкуль і куды,
як човен,
што повен
чысцюткай вады.

То ўправа,
то ўлева
хілілася крышку.
І вось
зачапілася
за тэлевышку.

І стала адразу
нібыта ў тумане
Футбольнае поле
на нашым экране.

Дзе мяч?
Дзе вароты?
Не ведаем —
што там?
А хмарка
дажджынкамі
сыпле,
як шротам.
— Даволі!
— Плыві ўжо! —
у хмаркі
мы просім.
Ды толькі
не ўпросіш
упартую восень.

Фота ГАННЫ КАНДРАЦЮК

Трэці клас і настаўнікі — Марыся Казімярук і Славамір Кулік

Усе — дэкламатары!

— Д-о-б-р-ы дз-е-нь! — прывіталі мяне хорам трэцякласнікі.

— Сядайце! — загадвае дзеткам пані Марыся Казімярук. — Сёння да нас завітала „Зорка". А ведаеце „Зорку"?

— Т-а-а-а-а-к!!! — прагучала ў адказ.

У дзяўчынак і хлопчыкаў вясёлыя ўсмешкі, іграюць праменьчыкі ў вачах.

— A ja Panią widziałam? — заяўляе прыгажуня з залацістай касынкай.

— А я таксама цябе ведаю, — кажу дзяўчынцы. Наша знаёмства незвычайнае. З Эдыткай Наўроцкай пазнаёмілася я „па фатаграфіі". Дзяўчынка прымала ўдзел у конкурсе „Роднае слова".

— У гэтым класе ўсе дэкламатары, — адзначае пані Марыся. Аказваецца, сярод трэцякласнікаў вялікае спаборніцтва. Кожны хоча як найлепш выступіць на сцэне. Дзяўчаты, каб выказацца талентам, падбіраюць як найдаўжэйшыя творы.

— У нас яшчэ адна лаўрэатка, — настаўніца беларускай мовы прадстаўляе мне Басю Петручук. Бася ўдзельнічала ў раённым конкурсе ў Гайнаўцы.

Дзяўчынкі яшчэ раз прадэкламавалі мне свае вершы, а з-за таго, што ўсе хацелі дэкламаваць, мы хутка памянялі тэму. Нашы сябры расказалі пра ўрокі беларускай мовы:

— Найфайней, як на ўроку гульні, — заяўляе Адрыян Сурэль. Адрыяну найбольш падабаецца гульня ў „золата".

— А я люблю чытаць апавяданні і вершы, — кажа Гося Краўчук. У класе ўсялякія густы. Ёсць і такія дзяўчынкі, для якіх найцікавейшая граматыка. Ну, і, вядома, усе любяць спяваць.

Яшчэ перад тым як мы зрабілі памятны здымак, дзеткі праспявалі мне „Цячэ вада ў ярок".

У настаўніцкім пакоі мы пачулі, што трэцякласнікі збіраюцца ў Елянку. Разам з імі пані Марыся Казімярук і пані Бажэна Маркевіч — выхавацелька класа. Разам будуць сачыць за працэсам выпякання хлеба. Вясковая гаспадыня спячэ хлеб, які яшчэ цалкам нядаўна быў на кожным стале ў нашых вёсках. Але пра гэта яны самі паабяцалі напісаць у „Зорку".

Зорка

Фота ГАННЫ КАНДРАЦЮК

Магда

Магда Саковіч, хаця ўжо ў шостым класе, выступіла ў фірменнай кашульцы беларускага садка. Разам з Міхасём, малодшым брацікам-дашкольнікам, які ходзіць у беларускі садок, дайшлі аж у цэнтральны этап „Роднага слова". І Магда, і Міхась атрымалі вылучэнне.

У выкананні беластоцкай шасцікласніцы публіка пачула верш А. Кобец-Філімонавай „Дзед Мароз". Аказваецца, любімы Санта Клаўс, як па-іншаму завем добрага Мароза, можа быць куслівым і патрабавальным. Гэта перасцярога ўсім дзецям, якія разлічваюць на тое, што навагоднія падарункі падаюць з неба!

Зорка

Казкі дзяцей Беларусі

Здарэнне ў горадзе Граматыка

У адным казачным горадзе жылі-былі Суфікс, Корань, Канчатак і Прыстаўка. Яны моцна сябравалі, ніводнага разу не пасварыліся. І ў гэтым жа горадзе жыла злая чараўніца. Звалі яе Арахна. Яна вельмі не любіла ласкавых слоў. Напрыклад, сур'ёзнае слова „дом" ёй падабалася, і яна лічыла яго самым лепшым. А слова „домік" не любіла, лічыла яго непрыгожым.

Аднаго разу сябры нашага горада вырашылі скласці слова „кветачка". Пачалі думаць: каму станавіцца ў пачатку слова, а каму — у канцы. Пачалі штурхацца, скакаць з месца на месца. Убачыла Арахна, як сябры складаюць слова, адразу ўсхапілася, пачарнела ад злосці. Усё навокал завіхурылася, падняўся моцны вецер. Разам з ветрам прыляцела чараўніца да Суфікса, Кораня, Прыстаўкі і Канчатка. Забараніла ім складаць ласкавае слова, а яшчэ адабрала ў іх сонца — за чорную хмару схавала. Навокал адразу пацямнела, быццам вечар нечакана падкраўся. Дружбакі засумавалі. Сталі думаць, як з такога становішча выйсці.

Дарога

Калі твае ногі стануць на якую-небудзь дарогу, яны цябе кудысьці завядуць. Дарога вядзе ад — да. Ад аднае мясцовасці — да другое. Ад аднаго месца, з якога выйдзеш, да таго, куды зойдзеш ці заедзеш. Рэдка дарога канчаецца тупіком, і яна тады няпоўная. Няма дарог нікуды. Дарогі самі не вызначаюцца. Ёсць дарогі, якіх ужо няма. Зараслі лесам, накрыліся полем, забудаваліся дамамі.

— Тут была дарога, — паказала бабуля Ганна на луг, зарослы лазой і алешнікам. — Даўно, не за майго часу. Спачатку грэблю людзі насыпалі, бо балаціна наўкол была, не перабрацца. Ішлі людзі да знахара, ехалі нават з далёкіх краёў, каб палекавацца ці зеллем, ці добрым словам. Знахар жыў на сухім грудзе, у здаровым месцы. Месца добрае, дык люд пачаў пасяляцца, вёску заснавалі. Жылі пару стагоддзяў, а цяпер, вось, і вёска знікла, бо людзей няма...

Няма жыхароў, няма дарогі, а бабуля Ганна ўсё адчувае той скразняк, у якім перамяшчаліся людзі. Для таго, мабыць, у яе схільнасць — бачыць нябачнае, чуць нячутнае. Баба Ганна — спадчынніца таго знахара Бабы. Бо ўмее выгнаць „вецер" ды застуду з касцей, выпаліць ружу... Хоць вочы ў яе такія слабыя, што і акуляры не памагаюць... Мала хто карыстаецца бабулінымі ведамі, людзей жа мала, а яна сама смяецца, што „прамоцыі" ёй не трэба, бо тады народ валіў бы дзвярыма і воканамі, каб палячыцца. Найбольш нервы людзей пужаюць, дык супакоіць іх трэба. Бо жывуць жа ў напрузе... Такі час сучасны.

— Ці і я магу пачуць гэтых людзей, што тут хадзілі? — пытаецца Паўлінка, бабуліна суседка, адзінае дзіця ў вёсцы.

— Можаш. Дзеці ўсё могуць. Нават іх пабачыць. Заплюшч вочы, чуеш вецер? Гэта праехаў на кані дружыннік. Спяшаецца да Бабы, па ратунак. Паранены...

— Гэта ў вайну! — падумала Паўлінка. — А тут, вось, прайшлі дзве цёткі з кошыкамі, з грыбамі. Чую пах свежых грыбоў, лесу! А тут пахне скурай каня... Даўно каня я не бачыла ў нашай вёсцы...

Сядзяць слепаватая бабуля і дзевяцігадовая дзяўчынка пасярод былой дарогі, услухваюцца ў былое.

Міра Лукша

Фота ГАННЫ КАНДРАЦЮК

Тэатральная група з Залук

Гутарка пра талерантнасць

Пра здарэнне, якое і сумнае, і смешнае, расказалі мне дзеці з Беластока. Такая гісторыя можа здарыцца кожнаму з вас, і трэба ведаць як павесці сябе ў такі момант.

На перапынку ў пачатковай музычнай школе гутарылі тры гімназісткі.

— A jaką masz jutro pierwszą lekcję? — спытала ў Галінкі сяброўка з групы Клеапатра Бальбіна.

— Język białoruski.

— O, Jezu! — ускочыла як апараная Клеапатра.

— I po co ty chodzisz na ten ruski język?

Галінка не хацела размаўляць з Клеапатрай, яна толькі паціснула плячыма і пачала пра другое. З Бальбінай не хацела спрачацца і Зося, яна ведала, што Галінка беларуска, і такая размова проста прымітыўная. Але ўсёй размове прыслухоўвалася срэбнавалосая Зосіна бабуля. Яна спакойна і тактоўна звярнулася да Клеапатры.

— А што дрэннага ты дзяўчынка бачыш у беларускай або рускай мове?

— Czy białoruska czy czarnoruska — to wszystko jakieś głupie, — адпаліла гімназістка.

Бабуля Зосі ўсё жыццё навучала англійскай мове. Яна сама нарадзілася ў Вільні і ў дзяцінстве сябравала з дзяўчатамі беларускамі. Людзі ведалі, што кожны звычайны чалавек павінен вывучаць сваю родную мову. Сяброўкі бабулі хадзілі ў беларускую гімназію і зараз калі яе ўнучка сустракалася з беларускамі, ёй вярталіся добрыя ўспаміны.

— Drogie dziecko, — сказала разважна бабуля — jakieś głupie są nie języki — tylko tacy ludzie, którzy tak mówią.

На шчасце Клеапатра Бальбіна не была да канца ідыёткай, яна пачырванела і папрасіла прабачэння ў Галінкі. Тут трэба дадаць, што Бальбіна тры разы ў тыдзень хадзіла на дадатковыя ўрокі-рэпетыцыі па англійскай мове да бабулі Зосі.

Зорка

Ніна Мацяш

Мышыны гарошак

Мышыны гарошак
Не мае ножак,
І ручак не мае,
А луг вышывае:

Вусікамі
пачэпіцца за былінку —
Расхарошыць
ад нізу да верхавінкі
Прошваю сіне-ліловай:
Фарсуй абновай!

Фота ГАННЫ КАНДРАЦЮК

Агнешка

Пра вавёрак найахвотней думаем восенню, калі даспяваюць арэхі. Зразу хочацца схадзіць у гарадскі парк, палюбавацца дрэвамі і прыродай.

Агнешка Рэпнік, вучаніца Пачатковай школы н-р 3 у Бельску-Падляшскім, падрыхтавала верш „Вавёрка ў парку". Следам аўтара — Ніны Галіноўскай, дэкламатарка прымусіла нас палюбіць звярка. Мы маем на ўвазе прыгожае і адважнае выступленне дзяўчынкі.

Агнешка Рэпнік — лаўрэатка III месца цэнтральнага конкурсу „Роднае слова" ў Нараўцы.

Зорка

— Я прыдумаў! — раптам усклікнуў Корань.

— І што ты прыдумаў? Кажы хутчэй! — ажывіліся Суфікс, Прыстаўка і Канчатак.

— Ну тады слухайце, — сказаў разважліва Корань. Мы складзем слова „сонейка". Гэтая вядзьмарка Арахна пабачыць, што склалі слова, якое яна не любіць, возьме яе чорная злосць — і яна дальбог не вытрымае, памрэ ад злосці! А сонейка вернецца да нас, зноў будзе нам свяціць.

— Ура! — закрычалі сябры. — Малайчына Корань!

Не думаючы доўга, Корань стаў паперадзе, Суфікс стаў за Коранем, а Канчатак — за Суфіксам. Арахна, як убачыла такое, не вытрымала ўсяго гэтага, ад злосці павалілася і сканала.

Сонейка адразу ж выйшла з-за хмары, ласкава заззяла. Але Прыстаўка была сумная. Усе зразумелі, чаго яна сумуе. Паабяцалі ёй, што яшчэ шмат слоў складуць з Прыстаўкай. Цяпер жа ім ніхто не будзе перашкаджаць. Сябры пачалі весяліцца і складаць новыя словы, найболей — ласкавыя.

Таня Пасечная, Гомельская вобласць, г. Мазыр, СШ № 2

Польска-беларуская крыжаванка № 45

Запоўніце клеткі беларускімі словамі. Адказы (з наклееным кантрольным талонам) на працягу трох тыдняў дашліце ў „Зорку". Тут разыграем цікавыя ўзнагароды.



Адказ на крыжаванку н-р 41: Эра, панарама, кот, лук, Ала, юрта, сад, сарока, цана, штанга. Палац, нуда, мак, раса, мала, марш, юка, экран, рот, атака.

Узнагароды — **аўтаручкі** — выйгралі: **Анна Рубашэўская**, **Эвеліна Гайко**, **Агнешка Семянюк** з Бельска-Падляшскага, **Анна Раманюк** са Старога Беразова, **Паўліна Чурак** з Арэшкава. Віншуем!

„БАС” — не пагас!



Фота ГАННЫ КАНДРАЦЮК

Спаборніцтвы пад народную музыку-песню „Вісіт, ябко, вісіт”

Не памятаю яшчэ такіх „афлагаваных” Атрасінаў беларускіх студэнтаў — ужо з панадворка ўразіў нас падсветлены бел-чырвона-белы сцяг, які красаваўся ў вечаровым акне. Гарышча, дзе адбывалася імпрэза, было таксама аздобленае на патрыятычны лад. Незалежніцкі сцяг, побач „Пагоня”, на стале напой-медавуха „Гарадоцкая” ў культавай ужо бутэльцы з бел-чырвона-белай бардзюрай.

— А мы ўжо вас дачакацца не маглі! — вітаюць нас у парозе Нікан Шарамэта і Міхал Гжэсь, завадатары беластоцкага БАСу. Каб дапасавацца да інтэр’ера, Нікан прыадзеў белы летні капялюш перавязаны чырвонай стужкай. Першая задача для кандыдатаў у студэнты — таксама пад знакам незалежніцкіх сімвалаў. Першакурснікаў распранулі і апранулі ў кашулькі з бел-чырвона-белым сцяжком, падрыхтаваныя пад апошняе „Басовішча”. Ды, у якасці падарункаў, студэнты атрымалі літаратуру-перасцярогу — „Рабоў” лонданскага гісторыка Юры Весялкоўскага — кніжку прысвечаную праблемам незалежнасці.

Першакурснікі, пакуль паўтарылі за старэйшымі сябрамі словы прысягі, перайшлі даволі цяжкія выпрабаванні. Канкурэнцыі — якія ацэньвала надзвычайная камісія ў саставе: доктар Лена Глагоўская, магістр Гражына Харытанюк, доктар Алег Латышонак і ніжэйпадпісаная магістр — ледзь не лопнулі ад смеху. Другакурснікі праверылі ўмеласці кандыдатаў у студэнты шматгранна — ад чытання „Буквара”, праз спаборніцтва па чышчэнні на час фільцавых чобатаў і даенні белавежскіх „зубрыц”, па шарж на партрэт Аляксандра Лукашэнкі. Сацыяльна-палітычная тэматыка была насычана смешнай эротыкай, якая хутчэй нагадвала пародыю камп’ютэрных секс-сайтаў.

Таксама, калі прыйшоў час спеваў і танцаў, студэнты расшумеліся як белавежская дуброва. Рэпертуар іх быў шырокі і разнавідны: ад шэдэўраў з „Народнага альбома” па несмяротныя „А ў полі два дубочкі” са спяваннем на ролі (перамаглі дзяўчаты!). Вялікая перамена і ў мове студэнтаў. Многія з удзельнікаў свабодна карыстаюцца беларускай мовай, некаторыя, хаця з дому польскамоўныя, між сабой размаўляюць па-беларуску.

Атрасіны беларускіх студэнтаў ужо чарговы раз адбыліся ў Супраслі, у гасцінай дачы спадарства Латышонкаў. Ноччу з 17 на 18 кастрычніка гуляла тут за трыццаць басаўцаў ды не толькі... Шкада толькі, што студэнцкія „Атрасіны”, ужо з добрых дзесяць гадоў адбываюцца ў малым крузе і датычаць яны ў асноўным толькі студэнтаў беларусістыкі.

Ганна Кандрацюк

Фота ГАННЫ КАНДРАЦЮК

Шарж на партрэт Аляксандра Лукашэнкі

Фота ГАННЫ КАНДРАЦЮК

Гаспадар дачы, д-р Алег Латышонак, ледзь не лопнуў ад смеху

Фота ГАННЫ КАНДРАЦЮК

Хто хутчэй пачысціць чобаты-фільцы — кадр з беларускага жыцця

Паэтычнае трохгалоссе

Ужо чацвёрты раз у Бельскім доме культуры прайшоў дэкламатарскі конкурс „Паэтычнае трохгалоссе”. 17 кастрычніка а 10 гадзіне пачаліся змаганні вучняў падставовых школ і гімназій з Бельска-Падляшскага, Аўгустова, Орлі, Храбалоў і Чаромхі.

У групе вучняў падставовых школ выступіла 32 дзяцей. Наймалодшай удзельніцай была 4,5-гадовая Юлія Валосік, якая за вершы Івана Муравейкі „Прытворка” і Дароты Гелнер „Дождж” атрымала вылучэнне.

Папулярнасцю юных дэкламатараў карысталіся вершы беларускіх пісьменнікаў: Івана Муравейкі, Эдзі Агняцвет, Кандрата Крапівы, Станіслава Шушкевіча, Надзеі Артымовіч. Радзей чым у папярэднім годзе, бо толькі два разы, чыталіся вершы Віктара Шведа.

Удзельнікам трэба было прадэкламаваць два вершы — адзін на польскай мове, а другі — да выбару — на беларускай, украінскай, а апошнім часам і рускай мовах (як заўважыла арганізатарка конкурсу Альжбета Фіёнік, назва конкурсу павінна гучаць „Паэтычнае чатырохгалоссе”).

Сярод удзельнікаў пачатковых школ Гран-пры за дэкламацыю вершаў Яна Бжэхвы „Бегемот” і беларускага „Не цяпер, то ў чацвер” здабыў Рыгор Красоўскі, які пасля аб’яўлення вынікаў з радасцю сказаў: — Добра, што мне ўдалося. Мама будзе ганарыцца — бо і памагала мне вучыцца вершаў, але большасць зрабіў я сам.

Фота ПАЎЛІНЫ ШАФРАН

Гран-пры заваяваў Рыгор Красоўскі

Першае месца здабыў Якуб Філіпюк, другое супольна Уршуля Шыманская і Юльянна Дораш, а трэцяе — Іаанна Марчук і Адам Адзіевіч.

З ліку 13 гімназістаў Гран-пры здабыла Эдыта Русіновіч за дэкламацыю вершаў „Вол і Жаба” і „Мой дзед”. Першае месца прыпала Юльянне Шчурак, а другое Агнешцы Смактуновіч.

Журы ў складзе: Тамара Русачык, Ева Якубашэк, Зофія Сачко і Аліна Рудчук доўга абмяркоўвала вынікі конкурсу. Ева Якубашэк з Ваяводскага асяродка анімацыі культуры лічыць, што дзеці забываюць аб асноўнай справе: дэкламацыя не заключаецца на тэатральнай інсцэнізацыі, жэстыкуляцыі, ні міміцы, бо самае важнае — мадуляванне голасу, інтанацыя, тэмп і разуменне тэксту.

Сярод удзельнікаў не было незадаволеных, бо кожны з іх атрымаў дыплом, прыемна правёў дзень з сябрамі і паслухаў музыку ў выкананні гуртоў „Журавінка” і „Ранок”.

Паўліна Шафран

Вяртаючыся з Расіі

У змагара за праваслаўе

Вяртаючыся з Расіі затрымаліся мы ў Брэсце, каб наведаць Свята-Афанасьеўскі мужчынскі манастыр.

У манастыр дабраліся мы на „маршрутках". На манастырскім панадворку было пуста: ні паломнікаў, ні манахаў. Невялікая царква, перароблена з капліцы, была нядаўна памаляваная і не змянілася ад апошняй маёй пабыўкі некалькі гадоў таму. Не заўважыў я новых будынкаў. Каля старых — на прыгожа прыбраным панадворку красаваліся кветкі. У кухні сустрэлі мы жанчыну, якая паведаміла нам, што манахі абедаюць пасля доўгага богаслужэння. Неўзабаве выйшаў да нас ігумен Варсанофій і завёў у царкву. Прылажыліся мы да часціцы мошчаў св. прападобнамучаніка Афанасія, якая знаходзіцца ў іконе і да часціц мошчаў опцінскіх старцаў.

Ігумен Варсанофій паінфармаваў, што на месцы капліцы або непадалёк ад яе быў забіты прападобнамучанік Афанасій. У 1993 годзе ў капліцы Літургію служыў мітрапаліт Варшаўскі і ўсяе Польшчы Васілій. Разбудова капліцы і адкрыццё манастыра адбылося ў 1996 годзе. Жыве ў ім некалькі манахаў. У час святкаванняў новую царкву наведваюць брэстчане. Ахвяраванні перадаюць таксама вернікі з розных краін. Замежныя госці цікавяцца жыццём прападобнамучаніка Афанасія і яго заслугамі для праваслаўя. У палове XVII стагоддзя хадзіў ён пяшком у Варшаву і на Сойме прасіў дапамогі для абароны ад наступу каталіцкага веравызнання. У 1648 годзе пасля цяжкіх мучэнняў св. Афанасій быў забіты. Пасля адкрыцця манастыра хутка сталі ўзнікаць і развівацца гарадскія і вясковыя праваслаўныя прыходы. Яшчэ пры жыцці прападобнамучанік Афанасій прадвяшчаў развіццё праваслаўя на Брэстчыне. Зараз у Брэсцкай епархіі 163 прыходы і такая ж колькасць святароў. Вернікі моляцца ў 143 цэрквах і 12 малітоўных памяшканнях. У 11 прыходах цэрквы будуюцца або рыхтуюцца месцы пад іх будову.

Зайшлі мы таксама ў Свята-Сімяонаўскі кафедральны сабор, дзе знаходзіцца рака з мошчамі прападобнамучаніка Афанасія і іншых святых. Пажылая жанчына мыла ў царкве падлогу, а мужчына чытаў акафіст да св. Афанасія. Неўзабаве выйшаў святар і адслужыў малебен. У святочныя дні богаслужэнні ўзначальвае тут епіскап Брэсцкі і Кобрынскі Іаан.

Беларускія мытнікі і пагранічнікі, якія кантралявалі нас у Высокім, былі вельмі ветлівымі. Нават не правяралі рэгістрацыі на жыхарства ў Маскве і Пецярбургу. У той час пагранічнікі з Гродна за адсутнасць прапіскі ў Расіі аштрафавалі маіх знаёмых па некалькі дзесяткаў долараў. Польскія мытнікі, кантралюючы сумкі пасажыраў, шукалі спіртных напояў і папяросаў.

Аляксей Мароз

Фота АЛЯКСЕЯ МАРОЗА

Свята-Сімяонаўскі кафедральны сабор

Фота АЛЯКСЕЯ МАРОЗА

Свята-Афанасьеўскі мужчынскі манастыр

На кшталт і падабенства

Выбраўся я ў Завыкі збіраць мемуарны матэрыял ад нашых старажылаў. На беластоцкім аўтобусным вакзале, апрача мяне, чакала група з чатырох асоб. З ахапкаў іх размоў, якія даходзілі да маіх вушэй, вынікала, што яны настаўнічаюць. Селі яны на той жа, што і я, аўтобус у Лапы. Вадзіцель, выязджаючы з аўтавакзала, павярнуў не направа, у напрамку Лапаў, але ўлева, быццам кіраваўся ў Саколку. Акружаючы цэнтр горада, аўтобус набраў яшчэ шасцярых пасажыраў, якім і так недалёка было да аўтавакзала. На язду вакол цэнтра Беластока ў час пік аўтобус патраціў паўгадзіны. Мо нейкі складальнік аўтобусных маршрут задумаў такім чынам пайсці на руку вясковым хілым аздаравенцам, што выпісваюцца з беластоцкіх бальніц ці такім жа пакупнікам, вязучым клункі з дабром. Толькі што ў тую пару зарана яшчэ на такіх пасажыраў. Але некаму ўсё-такі задумалася пракаціць загарадскім аўтобусам паўгадзінны рэйд па горадзе.

У Турасні-Касцельнай аўтобус з'явіўся дзесяць пасля восьмай — на пераадоленне пятнаццаці кіламетраў патраціў пяцьдзесят мінут; значыць гнаўся ён са скорасцю васемнаццаць кіламетраў у гадзіну. І ў той менавіта Турасні згаданыя ў пачатку настаўнікі кінуліся стрымгалоў у школу, што насупраць прыпынка, без аглядкі на заўсёды магчымыя гонкі па цэнтрагміннай вуліцы. Спазніліся яны на працу на прынамсі дзесяць хвілін, а праца ў сённяшні час вельмі каштоўная, у тым ліку і выпускнікам педфакаў. Да таго ж не надта аўтарытэтна выглядаў той адчайны бег у школу. Ці можна тады вельмі дзівавацца тым вясёлым падзеям, якія ў маі адбываліся ў адной са школ Торуня?

У Завыках зайшоў я ў раней намечаны дом, бо так менавіта ў той вёсцы трэба арыенціравацца. Гаспадар, калі я сказаў пра мэту свайго ў яго з'яўлення, заявіў, што мне нічога не скажа. Бо раней ужо быў сказаў праўду пра сваю даўніну, то яму суседзі шмат часу жыць не давалі. А суседзі тыя маюць на праўду іншы пункт гледжання толькі таму, што яны іншай канфесіі. Ну і вядуць яны своеасаблівую грамадскую цэнзуру. Вось такі матэрыял я сабраў для нашай гісторыі.

З Завыкаў пайшоў я ў Дакторцы, адкуль зручнейшае вяртанне ў Беласток. Пайшоў я не па шашы, але па пазначаным на карце турысцкім маршруце, праз лес. Акурат у той дзень завітаў на нашу зямельку доўгачаканы дождж, падаў ён настойліва і лясную дарожку за гадзіну часу замяніў ён у калюжыны і гразь. Прамок я да ўсіх ніток, да таго ж у сумцы прамоклі ўсе мае паперы. Але гэтая пляга неяк не трывожыла мяне, а тая халодная і дажджлівая адзінокасць нават радавалі, калі думаў, што шматлікім людзям яшчэ больш непрытульна чым мне.

Вярнуўшыся ў Беласток кінуўся я адагравацца і сушыцца, пры нагодзе ўключаючы тэлевізар. Галоўнай падзеяй дня была блакада Варшавы таксістамі. Аўтобус, што едзе з Беластока ва Вроцлаў, валокся праз сталіцу дзве гадзіны. Хто і куды на ім спазніўся, хай астанецца на баку ўвагі.

Не адным хлебам жыве чалавек, жыве таксама і эгацэнтрызмам, стварае ён вакол сябе свой космас, у якім стараецца стаць галоўнай фігурай. Ён жа, як вучаць тутэйшыя катэхізісы, на кшталт і падабенства. І мае быць так, як ён хоча, любой цаной!

А я, дурненькі, заміж гнацца за нейкімі правадырамі і дамагацца курсіравання аўтобуса ў Лапы па ўсіх кварталах Беластока ды блакіраваць вуліцы ці інфармацыі — каб мяне паказалі ў тэлевізары і каб хто іншы занадта дапытлівы не даведаўся чаго або сумленны куды не ўспеў, палез у зябкае бязлюддзе. Мо ўсё-такі нехта заўважыць, што я нікому нічым не шкодзіў, не змагаўся за кшталт і падабенства.

Аляксандр Вярбіцкі

Пяценка ў Канцавізне

27 кастрычніка ў Кажанскім прыходзе атаясамліваецца са святам Параскевы Сербскай (званай у народзе Пяценкай) у Канцавізне. Нічога ў гэтым дзіўнага, калі б не тое, што Канцавізна — малая вёска і няма там царквы.

Пачынаючы ад 1908 г. у гэты дзень Святая Літургія адбываецца ў хаце аднаго з жыхароў вёскі. Да службы падрыхтаваны адзін вялікі пакой. Штогод мяняецца месца на „хатнюю" літургію. Гэты цікавы звычай прыпамінае мінуўшчыну Канцавізны і Суража. Грунты, на якіх ляжыць вёска, належалі да пана Казлоўскага. У 1908 г. жыхары вёскі (м.інш. Цімох, Паплаўскі М., Крукоўскі Т., Зінчук А.) выкупілі Канцавізну ад пана. Ад таго ж (паводле старэйшых людзей) узялася і назва вёскі. Гэта быў апошні, канцавы прададзены маёнтак пана Казлоўскага, які перасяліўся ў Вільню. Людзі памятаюць, як іх дзяды вазілі грошы Казлоўскаму ў Віленскі банк.

На гэтых канікулах у Канцавізну прыехаў нашчадак Казлоўскага і хадзіў па вёсцы. Некаторыя баяліся, што хоча адабраць ім маёмасць. Але ён хацеў толькі паглядзець на маёнтак свайго прадзеда.

У Канцавізне свята Пяценкі ўзялося ад святкавання ў Суражы. Даўней у Суражы былі тры царквы. У адной з іх, асабліва святкавалі памяць Параскевы і гэты звычай людзі перанеслі ў Канцавізну таму, што ў Суражы няма больш праваслаўных. Вёска Канцавізна налічвае каля 30 жыхароў і апрача адной каталіцкай сям'і ўсе яны праваслаўныя. На жаль, пяць хат пустуе. Людзі займаюцца пераважна гаспадаркай. Да Кажанскай царквы — 13 км.

Па дарозе ў Канцавізну я праязджала праз Завыкі. На старых праваслаўных могілках, (дзе цяпер стаіць касцёл, пабудаваны як царква ў XIX ст.) можна паглядзець ацалеўшыя помнікі, паднішчаныя крыжы.

Застаецца толькі пажадаць жыхарам Канцавізны, каб надалей сцераглі і бераглі яны свае звычаі. І як сказаў а. Ян Карпюк, настаяцель прыхода ў Кажанах, няхай ува ўсім дапамагае жыхарам Канцавізны святая прападобнамучаніца маці Параскева.

Анна Садоўская

Кавалерысты ў казармах у Сувалках; Юльян Бура другі злева ў апошнім радзе

Адпачынак у Белавежскай пушчы ў 1928 годзе; Юльян Бура другі злева, Ян Бура першы справа

Мінаюць гады, астаюцца ўспаміны

У 1904 годзе ў Рудні нарадзіўся мой бацька, якога ягоныя бацькі Галена і Андрэй Бура ахрысцілі Юлікам. Так як і ўсе яго равеснікі дапамагаў бацькам на гаспадарцы разам з братам Іванам і сястрой Вольгай. Гаспадаркі ў Рудні былі малыя, вузкапалосыя, на слабых землях, а праца выконвалася простымі прыладамі: сахою, бараною, сярпом ці цэпам. Гэтыя цяжкія ўмовы жыцця прымушалі сялян шукаць заробкаў далёка ад родных дамоў. І Юлік з Іванам дзеля заробкаў шматразова адпраўляліся на арэльку ці на высечку дроў у Белавежскую пушчу. Праца ў пушчы была цяжкая, не было тады добрых прыладаў для апрацоўкі драўніны: ручная піла, сякера ды клін са стругам былі ад досвітку да змяркання неадлучнымі спадарожнікамі руднянскіх хлопцаў. Харчаваліся яны тым, што прынеслі на сваіх плечах з роднае хаты, хадзілі ў пасталах.

Праходзілі гады і Юліка прызвалі ў войска. Службу ад 6 кастрычніка 1925 года да 25 кастрычніка 1927 года ў кавалерыйскім 3 палку швалежэраў у Сувалках закончыў ён у званні старшага швалежэра.

Мінулі чарговыя гады і ў 1939 годзе над Польшчай павісла ваенная пагроза з боку Германіі. Была аб'яўлена мабілізацыя і Юлік Бура зноў трапіў у свой полк у Сувалкі. Салдаты даведаліся, што абставіны сур'ёзныя, але не безнадзейныя.

Полк уступіў у няроўны бой: немцы былі лепш узброены, іх аўтаматы і танкі разрушылі камандаванне польскім атрадам, коні выходзілі са строю, стала бракаваць харчоў, асабліва хлеба. І хаця польскія злучэнні папаўняліся новымі рэзервістамі, аднак нястача ўзбраення штораз больш ускладняла абставіны. Быў ранены камандзір бацькавага швадрона, былі ранены і забіты іншыя жаўнеры. Полк усё ж такі не быў разгромлены і неўзабаве бацька трапіў у палон Чырвонай Арміі.

Нямецкая акупацыя адразу праявіла свой жорсткі характар: палілі вёскі, расстрэльвалі нявінных людзей. Маладыя людзі сталі ўцякаць у лес, хаваючыся ад вывазкі на прымусовыя работы ў Германію, арганізавалі партызанскія атрады. Некаторыя жыхары нашых вёсак дабравольна спяшалі служыць немцам: солтысамі, жандарамі, шпікамі, правакатарамі — яны гатовілі спіскі для вывазу ў Германію прымусовых работнікаў. Арганізаваліся прымусовыя работы і тут, на месцы — звозка камянёў для будовы дарог. Накладваліся кантынгенты — абавязковыя пастаўкі немцам збожжа, мяса, малака, яек, налогаў, а калі хто з імі не спраўляўся, таму пагражалі высокія кары ўключна з расстрэлам.

Калі набліжаўся канец нямецкай акупацыі і падыходзіла Савецкая Армія, жыхары суседняй вёскі Рыбакі задумалі паставіць прывітальную браму на дарозе ад Рудні. І хаця матэрыял на тую браму быў ужо нарыхтаваны ў лесе, аднак людзі пабаяліся, што немцы могуць вярнуцца і пабачыўшы тую браму павесяць на ёй жыхароў вёскі. І такім чынам прывітальнай брамы чырвонаармейцам не ўдалося паставіць.

Мой бацька быў наймалодшым дзіцём у сям'і, таму не меў магчымасці астацца дома і быў вымушаны пайсці ў прымы. У 1935 годзе прыстаў ён да Насці Лаўрашук у вёску Рыбакі. Бацькі заняліся гаспадаркай, трымалі некалькі кароў, авечак, свіней, кабылку „Каштанку". Нажылі двое дзетак: дачку Тамару і мяне. Мая мама была вельмі начытаная, напр. „Анну Карэніну" прачытала пяць разоў, любіла чытаць Талстога, Пушкіна, Купалу, Коласа, а тыднёвік „Ніву" чакала кожны тыдзень як найлепшага госця. Бацька ў вольны час займаўся рыбалкай, прыгожа спяваў песні, асабліва „Ułani, ułani, malowane dzieci" і „Чорны воран". Пра вайсковыя справы, кавалерыю, мог апавядаць доўгія гадзіны. Заўсёды лічыў сябе беларусам, быў добрым і сумленным чалавекам.

Віктар Бура

Ю. Бура ў кавалерыйскай уніформе

Як брат з братам

Што яднае мужыкоў? Пляшка ды армія. Пляшка раскруне гавэнду, прывядзе ўспаміны. А з кім ты ў арміі быў — ён табе больш за звычайнага сваяка. Ты з ім разам стаў мужчынам! Братам у мужчынскім саюзе. Гэта не проста калега, кампаньён. Разам з ім адчуў ты гонар звання мужчыны. Незмывальны знак на душы. І калі праз гады сустрэнецеся адны з аднымі, дык гэта свята большае, чым сямейная імпрэза. Кім бы ты цяпер не быў...

Раман Караган жыў адзін. Не ўдалася яму сямейная справа, як то ў жыцці не аднаму ці не адной бывае. Больш аднаму ці другому, бо хто ж зразумее мужчыну ў гэтым складаным свеце, дзе трэба быць мужным, стойкім, працавітым без працы... Жонка пакінула яго, казаў, што пайшла за грашыма, забраўшы дзяцей. Ну, цяжка было Раману ўтрымаць сям'ю за адну зарплату, але людзі горш яшчэ маюць. Калі ягонай жонцы лягчэй жыць з аліментаў ды падмацунку сацыяльнай апекі, ці ў маткі ў хаце, дык няхай. Прынамсі ніхто яму цяпер у галаву не дзяўбе, што іншыя лепш маюць за іншымі мужыкамі. Расталіся без асаблівай сваркі, як то бывае на разводах, падзяліўшы справядліва па палове сціплыя пажыткі. Хату таксама — трохпакаёўку замянілі на дзве кватэры, Раман стаў жыць у „кавалерцы". І танней, і здаравей. І ніхто не перашкаджае сустракацца з кім хочаш.

Неўзабаве месца пражывання Рамана Карагана было вядомай мэтай сустрэч самотных мужчын. Мужчынская адзінота як даймае! Справа агулам — у міжчалавечых адносінах, а гэта час часом залежыць ад полу, альбо і не. Раман трымаў хату ў чысціні, ніякі ні прытон там каб быў. Прыйдуць людзі, кульнуць па чарцы, пагамоняць ды разыдуцца. Калі хто не мае дзе паспаць, а карыстаецца даверам гаспадара, дык і пераначуе. Не будзеш жа браць за начлег з кампаньёна, які выплача на тваім плячы ўсе свае крыўды ды болі. Пашкадуеш. Хоць бываюць такія, што абрыднуць дашчэнту. А іх і не мусіш слухаць, хай толькі думаюць, што чуеш ды спачуваеш, і так чалавеку лягчэй робіцца на душы. Ну, бывае, усё ж, што гатоў ужо абрыдлага наведвальніка як тую бурую жабу страсянуць з пляча, так надаесць... Ды скажаш слова, зразумее, што гаспадар павінен час ад часу пабыць адзін альбо ў пары з братняй душой іншага полу... То і гыркнеш, і кулаком грукнеш у стол — парадак мае быць! Бо ж характары розныя ў людзей... Бывае, і трэпнеш нахабу, каб адчапіўся, *даў спокуй* ды жыць даў!

А калі цябе наведае сябра з арміі?! Гэта так, бы брат родны з далёкае краіны прыехаў! Даўно не бачаны! Іншыя сябры ў той час малаважныя робяцца, марнеюць чужыя і свае клопаты...

Трапіў, вось, да Рамана Карагана Уладзімір Ялавік, родам з Саколкі, ды бываўшы ў свеце ад доўгага часу. Калісь часта ліставаліся, паведамлялі, што чуваць у хаце ды свеце, нават высылалі адзін аднаму здымкі. І хоць на працягу тых дваццаці пару гадоў добра змяніліся, ці ж не пазнаеш свайго найлепшага сябра ў гэтым таўставатым дзядзьку ці сухім, пачарнелым ад ветру, усё маладжавым жвавым хударляку? Кінуліся Раман з Валодзем у абдымкі, аж, здаецца, косці затрашчаць. На стол бабахнула бутэлька, другая, задымелі стравы — Раман любіў і ўмеў добра згатаваць. Ад усяго таго Раман забыўся, што абяцаў не піць шмат, бо ж лекар напалохаў, надаваў таблетак. Мабыць, лепш было б увогуле не кранаць алкаголю, бо ж напісана на брашурках, што нельга пры іх прымяненні ўжываць нават піва. На нервы, так сказаць, тыя лекі. А хто нерваў не мае! Найлепш жа ж і супакойваюць, і адвагі дадаюць, і ўцехі, так ці не, гарэлка, віно...

Паганіў Раман іншых кампаньёнаў, ды спакою не было. Ці ж няма начное крамы, каб сабе гарэлку купіць? Ужо з бейсболавым калком выйшаў быў Раман, напалохаць назолаў пад брамкай. Вярнуўся да сябра, зноў выпілі. Нагаварыліся ўволю, паснулі...

— Гарэлка кончылася, — заўважыў, праснуўшыся, Уладзімір. Раман не рэагаваў, хроп. Валодзя скалануў яго за плячо. Куксануў пад бок. Урэшце пачаў будзіць больш змястоўна, стаў ракам над ім, узяўся трасці за плечы...

Гаспадар спрасонку схапіў за нож, стаў адмахвацца ад напасці. Ці снілася яму яшчэ тое змаганне з агрэсарам, ці палічыў, што ўварваліся ў хату бандыты... Вялікі кухонны нож быў навостраны якраз учора...

Лукаш Правасуд

З месячнага боку

Дарагая Домна! Прысніўся мне мой прыяцель-літаратар. Прыехаў ён на аўтарскую сустрэчу ў Беласток. Сустракаемся на галерэі высокага паверха, ідзем, размаўляем. Ён пачынае заляцанні. Я ў адказ вяду ігру. Прыяцель усё больш распалены, адварочваецца, ідзе ў другі бок, пасля зноў мяне даганяе. Клянецца ў каханні, стае пасярод аснежанай вуліцы на калені, спявае. Паводзіць сябе як той алень у час рытуальных залётаў. Я адчуваю над ім уладу. Раптам бачу, што мой хлопец п'яны-пянюсенькі, ён ледзь ужо ідзе. Балбоча:

— Ты мяне кахаеш? — пытае.

— Споко, — кажу, — але не хочацца даваць абяцанку п'янаму.

Мой прыяцель ідзе на край галерэі і кідаецца з высокага паверха ўніз, на бетон. Бабахнуў! Бачу: ляжыць яго цела, побач валяецца галава. Думаю сабе: што я нарабіла?! Божа! То ж вінаватая тут мая ігра. Перажываю шок і адчуваю, што ўсё мацней мучыць мяне сумленне. Стаю як той слуп, плачу. Раптам — мой прыяцель падымае свой корпус з зямлі, накладвае на сябе голаў і заяўляе:

— Гэта мой маленькі перформенс для Беластока!

Прачынаюся і чую, як за акном крычаць адлятаючыя на поўдзень жураўлі. Думаю чамусьці пра святога Меркурыя Смаленскага, які пасля пабоішча на татарскім полі пайшоў з галавой пад пахай і перабіў усіх татараў. Юля

Юля! Сама бачыш, нездарма людзі кажуць: з каханнем, як з маланкамі, няма жартаў. Сон папярэджвае цябе, што страла кахання-маланкі раптам і ў цябе можа смальгануць. Твой аповед у многім раскрывае сутнасць кахання. Неспадзявана можа трапіць у кожнага, і калі яна сапраўдная, умее памяняць чалавека. Паэты пішуць пра гэта вершы, а барды спяваюць: *Prawdziwa miłość zazwyczaj dłużej trwa niż kilka sekund, prawdziwa miłość zostawia trwały ślad w człowieku...*

У тваім сне каханне таксама з'яўляецца „раптам". Ад стагоддзяў так ужо запісана: не ведаем ні дня, ні хвіліны, калі яно з'явіцца. Увесь космас спрыяе каханкам: ён прыязджае, ёсць сустрэча і атмасфера з мастацкім палётам, а пасля выходзіць з усяго спектакль: галоўныя ролі іграеш ты і твой амант.

Мушу цябе перасцерагчы: мей вока на прыяцеля, бо з яго нядрэнны мастак. Са сну відаць, што ў яго больш таленту да літаратуры як да залётаў. Можна яго зразумець, каханне адбірае розум. Як страціш голаў — не чакай мыслення.

Наўрад ці што іншае можа так памяняць чалавека, як каханне. Ты, для прыкладу, бачыш свайго прыяцеля як звяра. На жаль, ён не леў і не тыгр, толькі алень у рытуальных залётах. Каханне чаруе, нават алень пасля выпіўкі можа перакінуцца ў дзікага, ваяўнічага звяра. Няма значэння, што ў той самы час замест, прыкладна, тыгра, бачым перад сабой асла. З каханенем як з алкаголем — трэба асцерагацца. Калі п'еш або кахаеш — ты сама найменш бачыш, і нават не прыкмеціш, як станешся сімвалам дурноты.

Юля, як многа жанчын, калі кахаеш, ты небяспечная какетка. Ты рамантычная, нявінная. У сваім каханку бачыш рыцара, а нават святога. А ён бачыць у табе прынцэсу. А якая дзяўчына, скажы, пра такое не марыць? Лёс падсоўвае табе хлапца з палётам. На дадатак ён для кахання зробіць усё. Твой артыст свой палёт скарыстаў, як бачым, слова ў слова і скочыў з вежы. Ты адчуваеш сябе вінаватай. Такая з мяне дрэнная жанчына — думаеш. Памятай, ён пакуль скочыў, раней закахаўся, страціў голаў. Твой сон раскрывае дзве праўды пра тваё каханне. Першая: зменная як поры года. Летам кахаеш, а восенню можаш адляцець з жураўліным ключом. Другая: каханне бывае як жарт ад лёсу. Бывае як жыццёвы перформенс-спектакль з лёгкім для адгадання замыслам, часам яго сэнс прыхаваны глыбей. Выглядаеш цяпер і думаеш: „Дзе жа ж ты, маё каханне? Дзе жа ж ты, мая любоў"? А адказ як і пытанні — у музычным альбоме мінскага гурту „Крамбамбуля" — *Няма, няма, ня-ма-а-а-а!*

Што зрабіць у такой сітуацыі, пытаеш. Можа варта ўсё гэта абярнуць у жарт, як зрабіў гэта твой трагічна-камічны амант? Хто ведае, а РАПТАМ: тваё сэрца, што прагне шчаслівага палёту, трапіць на адпаведны самалёт!

Домна (domnason@wp.pl)

Фота МІХАЛА МІНЦЭВІЧА

Чучалы рысяў у Прыродна-лясным музеі ў Белавежы

Рысь у Белавежскай пушчы

З 1989 года паляванні на рысяў і ваўкоў у польскай частцы Белавежскай пушчы спынены (хаця выступае цяжкае для ацэнкі браканьерства), бо даследаванні паказваюць, што рысь апынулася пад пагрозай гібелі. Рысь, гэта звер вельмі скрыты і чалавеку вельмі цяжка наглядаць за ім.

На рысяў у Польшчы палюецца (па-за абшарам Белавежскай пушчы) з 1 лістапада да канца сакавіка; для параўнання: у даваеннай Польшчы дазвалялася гэта на працягу толькі аднаго месяца — з 15 снежня да паловы студзеня. Сёння рысь штораз больш лічыцца „помнікам прыроды".

Апошнія 150 гадоў у гісторыі буйных драпежнікаў (з кароткімі перапынкамі), гэта час іх вынішчэння. У Белавежскай пушчы ў 1869-1880 гг. было праведзена 188 аблаў, у час якіх адстрэлена і атручана 38 рысяў, 5 мядзведзяў і 471 воўк. Сёння рысям пагражае ў нас цалкавітае зніштажэнне, у асноўным з прычыны падзелу пушчы. На беларускім баку паляванні на рысяў і ваўкоў адбываюцца без абмежаванняў. На польскім баку ў 1989-1991 гг. браканьеры забілі 3 рысі, у тым ліку адну з радыёашыйнікам.

У Польшчы ў 1990 годзе было 408 рысяў, з чаго ацэньвалася, што ў Белавежскай пушчы было іх 10-16 штук. Зімою 1991/92 у выніку браканьерства і адстрэлаў на беларускім баку пушчы лік дарослых рысяў паменшаў да пяці штук.

Пушчанскія рысі харчуюцца галоўным чынам капытнай звярынай. Алені і сарны складаюць 25% іх ахвяр, здарыліся і два дзікі. Сярод ахвяр рысяў не зафіксавана ні ласёў, ні зуброў. Вялікай здабычай, напрыклад, аленем або сарнай, рысь харчуецца 3-5 дзён. Рысі дакладна яе хаваюць перад іншымі драпежнікамі, дзень праводзяць у гушчары, здалёк ад яе, а голад сунімаюць толькі вечарам. Рысі, гэта звяры скрытыя і рэдкія. Пра гэта сведчыць нават тое, што ніводнае ўрочышча ў Белавежскай пушчы не атрымала назвы ад іх, у адрозненне ад іншых звяроў, напр. Воўчыя грудкі ці Казловыя баркі.

Рысь водзіць 1-2 кацянят і яны вельмі залежныя ад мацеры; яе смерць перад іх самастойнасцю ў прынцыпе абазначае і іх галодную гібель. У 1991 годзе адна рысь была забіта і яе кацяня не выжыла, калі ў той жа час іншае рысяня, якое аставалася пры маці, праз год палявала ўжо самастойна.

Рысь не баіцца суседства людзей, калі мае дастаткова сховаў і шляхоў уцёкаў. Назіранні белавежскіх вучоных паказалі, што ў глыбіні пушчы, у леснічоўцы Глушэц, рысь праводзіла ночы на падстрэшку стадолы.

Даўней рысі лічыліся шкоднікамі, сёння назіраецца іх станоўчую ролю ў прыродзе і няма найменшых сумненняў, што гэтых прыродных ворагаў вялікіх расліннаедных млекакормячых трэба ахоўваць не толькі дзеля іх, але і дзеля захавання раўнавагі ў біяцэнозе.

Міхал Мінцэвіч

Гайнаўка

Бясплатная праверка лёгкіх

Бурмістр Гайнаўкі і Непублічнае прадпрыемства аховы здароўя (НПАЗ) „Гаймед" 15 і 16 лістапада г.г. правядуць бясплатную праверку лёгкіх. Амбуланс будзе стаяць перад будынкам Гарадской управы ў Гайнаўцы па вул. А. Зіна, 1. У суботу, 15 лістапада абследаванне будзе праводзіцца ад 9 да 15 гадзіны і ў нядзелю, 16 лістапада, ад гадзіны 8 да 15.

Запісвацца можна ў НПАЗ „Гаймед" па вул. Ю. Пілсудскага, 10, ад гадзіны 10 да 18. Пры рэгістрацыі трэба прад'явіць пасведчанне асобы (пашпарт).

(яц)

Пачаліся лекцыі

У панядзелак, 27 кастрычніка, у Цэнтры праваслаўнай культуры ў Беластоку распачаўся цыкл лекцый у рамках Праваслаўнага універсітэта культуры. Першы даклад, прысвечаны пытанням падліку часу і календарам, зачытаў епіскап Беластоцка-Гданьскі Іакаў. Спасылаючыся на астраномію і метафізіку ўладыка даказваў правільнасць юльянскага календара і прыводзіў аргументы ў яго карысць. Даклад суправаджаўся візуальнымі анімацыямі. Паслухаць лекцыю прыйшло шмат народу — канферэнц-зала цэнтра была набіта бітком. Чарговыя штомесячныя даклады, прымеркаваныя да кранаючых праваслаўя спраў, будуць таксама праводзіць царкоўныя іерархі.

(ав)

Папраўка

У артыкуле „З камітэта ў таварыства", апублікаваным у „Ніве" № 43 ад 26 кастрычніка г.г. мною было памылкова пададзена прозвішча галоўнага бухгалтара. З'яўляецца ім **Аляксандр Харкевіч**.

Старшыня былога Грамадскага камітэта будовы Музея і асяродка беларускай культуры ў Гайнаўцы Ян Хіліманюк звярнуў мне ўвагу, што ў час з'езда камітэта Віктар Бура, чытаючы пратакол з працы рэвізійнай камісіі, прадставіў непраўдзівыя інфармацыі. Паводле Яна Хіліманюка, у пратаколе рэвізійнай камісіі няма персанальнай прапановы адклікання з пасады старшыні Яна Хіліманюка і галоўнага бухгалтара Аляксандра Харкевіча (аб чым я пісаў), а ёсць толькі агульны запіс: „Звольніць з працы асобы, якія спрычыніліся да недапрацовак і няправільнасцяў як у парадкаванні экспанатаў, так і ў фінансава-бухгалтарскім справаводстве".

За дапушчаную мною памылку і няправільнасці зацікаўленых асоб і чытачоў перапрашаю.

Аляксей Мароз

Ніва ТЫДНЁВІК БЕЛАРУСАЎ У ПОЛЬШЧЫ

Выдавец: Праграмная рада тыднёвіка „Ніва".
Старшыня: Яўген Мірановіч.
Адрас рэдакцыі: 15-959 Białystok 2, ul. Zamenhofa 27, skr. poczt. 149.
Тэл./факс: (0 10xx 85) 743 50 22.
Internet: *http://niva.iig.pl*
E-mail: *redakcja@niva.iig.pl*

Zrealizowano przy pomocy finansowej Ministerstwa Kultury.
Галоўны рэдактар: Віталь Луба.
Сакратар рэдакцыі: Аляксандр Максімюк.
Рэдактар „Зоркі": Ганна Кандрацюк-Свярубская.
Публіцысты: Мікола Ваўранюк, Аляксандр Вярбіцкі, Ганна Кандрацюк-Свярубская, Міраслава Лукша, Аляксей Мароз, Ада Чачуга, Паўліна Шафран.
Канцылярыя: Галіна Рамашка.
Камп'ютэрны набор: Яўгенія Палоцкая, Марыя Федарук.
Друкарня: „Orthdruk", ul. Składowa 9, Białystok.
Tekstów nie zamówionych redakcja nie zwraca. Zastrzega sobie również prawo skracania i opracowania redakcyjnego tekstów nie zamówionych. Za treść ogłoszeń redakcja nie ponosi odpowiedzialności.
Prenumerata: 1. Termin wpłat na prenumeratę na I kwartał 2004 r. upływa 5 grudnia 2003 r. Wpłaty przyjmują urzędy pocztowe na terenie woj. podlaskiego i oddziały „Ruch" na terenie całego kraju.

2. Cena prenumeraty na I kwartał 2004 r. wynosi 26,00 zł.

3. Cena kwartalnej prenumeraty z wysyłką za granicę pocztą zwykłą — 115,00; pocztą lotniczą Europa — 127,00; Ameryka Płn., Płd., Środk., Afryka, Azja, Australia — 153,00. Wpłaty przyjmuje „RUCH" S.A., Oddział Krajowej Dystrybucji Prasy, ul. Jana Kazimierza 31/33, 01-248 Warszawa, Pekao S.A., IV O/Warszawa, Nr 12401053-40060347-2700-401112-005.

4. Prenumeratę można zamówić w redakcji. Cena 1 egz. wraz z wysyłką w kraju wynosi 3,40 zł, a kwartalnie — 44,20 zł; z wysyłką za granicę pocztą zwykłą — 4,70 (kwartalnie — 61,10), pocztą priorytetową: Europa — 5,90 (76,70), Ameryka Płn., Afryka — 6,60 (85,80), Ameryka Płd., Środk., Azja — 7,40 (96,20), Australia — 9,60 (124,80). Wpłaty przyjmuje Rada Programowa Tygodnika „Niwa", Białystok, ul. Zamenhofa 27, nr konta PBK S.A., I Oddział Białystok, 11101154-401150015504.

Н!ўка

Фота АЛЯКСАНДРА ВЯРБІЦКАГА

„Даўціпы" *Андрэя Гаўрылюка*

Паліцыянт запыняе шафёра, ад якога чуць гарэлкай:

— Добры дзень! Як вы называецеся?

— Можаш мне гаварыць Янка.

* * *

Журналіст бярэ інтэрв'ю ў старажыла:

— Вы, здаецца, з'яўляецеся найстарэйшым жыхаром горада?

— Не. Найстарэйшая мая жонка, але пра гэта ніхто не павінен ведаць.

* * *

Журналіст апытвае стогадовага дзедку:

— Чым растлумачыць тое, што вы дажылі стагоддзя?

— У мой час, — адказвае дзедка, паволі зацягнуўшыся дымам, — яшчэ не было вядома пра шкоднасць нікаціну.

* * *

— Вы не павінны піць кавы, — раіць лекар дзедку. — Гэта ў сапраўднасці павольная атрута.

— Сапраўды яна дзейнічае паволі: я п'ю яе ўжо семдзесят гадоў.

* * *

— Гавораць, што ажаніліся вы са сваёй жонкай таму, што яе дзядзька пакінуў ёй спадчыну ў мільён долараў?

— Гэта хлусня! Я ажаніўся б з ёю не зважаючы на тое, хто б ёй пакінуў той мільён.

* * *

Лекар да хворага:

— Запішу вам лякарства. Прымайце яго кожную гадзіну па адной лыжачцы.

— А ці можаце яшчэ запісаць на рэцэпт гадзіннік, каб я ведаў, калі той лек браць?

* * *

Журналісты апытваюць 120-гадовага жыхара Каўказа:

— Як сябе адчуваеце?

— Цудоўна! Сілы, якія я меў у маладосці, захаваў да сёння.

— А ці можаце гэта даказаць?

— Вядома. Бачыце тыя вялікія валуны каля млына?

— Бачым.

— Вось: так, як я іх не мог падняць у маладосці, так не магу і цяпер.

* * *

— Пан доктар, баліць мне левая нага.

— Гэта гады сваё робяць...

— Цікава! Маёй правай столькі ж, што і левай, а яна зусім мне не баліць.

* * *

Пажылая жанчына купляе ў краме мятлу. Перабрала мо з пяцьдзесят, на канец выбрала адну:

— Ну, што ж, як няма нічога парадачнага, дык хаця няхай гэтая будзе.

— Ці загадаеце выслаць яе на дом, — ветліва пытае прадавец пакупніцу, — ці адляціце на ёй асабіста?

* * *

— Вы не баіцеся так самотна сядзець ноччу ў дзяжурцы? — пытае знаёмы начнога стоража.

— Баюся датуль, пакуль не засну.

Адгаданка



1. адзінка з дзевяццю нулямі, 2. дыверсант або каларадскі жук, 3. блісукчая атмасферная з'ява або бельскі вакальны ансамбль, 4. спачуванне, літасць, 5. вялікі японскі востраў, 6. вялікая лясная птушка атрада курыных (*Lyrurus tetrix*).

(Ш)

Рашэнне адгаданкі атрымаецца з літар у светлых клетках, чытаемых зверху ўніз. Сярод чытачоў, якія на працягу месяца дашлюць у рэдакцыю правільныя рашэнні, будуць разыграны кніжныя ўзнагароды.

Адказ на адгаданку з 38 нумара

Ака, Быхаў, гоман, дзіця, Сож, хобі, цемя, цёзка, чэрнь.

Рашэнне: **Як многа ёсць рэчаў, без якіх можна абыходзіцца**.

Кніжныя ўзнагароды высылаем **Лукашу Пацэвічу** з Беластока і **Казіміру Радошку** са Свебадзіцаў.

Усямоцная Марыська

Усім знаёмая Марыя Піліпеня абяцала ўсё аформіць. І толькі знаёмым. А знаёмыя вераць знаёмым. Ахвяравалася м.інш. аформіць перапісанне зямлі на дачку знаёмаму Колі Здунюка. Даў ёй на гэта 3 тысячы новых польскіх злотых. „Залатвяла" і новыя кватэры, і куплю трактара, і візу ў Канаду. Чаго там не было! Я, праўда, хоць таксама знаёмы Марыі П., справы ніякае да яе не меў, але ў апошні час стала да мяне заходзіць. Падумаў, можа, хоча мяне неяк суцешыць наконт далёкага падарожжа мае жонкі Агаты, ну, у сэнсе паразмаўляць ад душы, каб весялей старому было. Прыйдзе Марыська, вып'е гарбату, чакае іншага, дык стаўлю каньяк. Загаворвае зубы, дык пытаюся: „Чаго ты, Марыська, ад мяне хочаш". Я такі мужчына, бачыце. Нашто доўгія размовы, калі можна адразу ясна ды спраўна даведацца, у чым справа. Думаю, напалохаю, калі вальну проста з мосту. А то, мабыць, якую надзею сабе робіць... Ну, жартую! Ніколі я не здрадзіў сваёй Агаце, дык і на старасць не зраблю такога глупства, тым больш сярод знаёмых грэх нашто рабіць!..

— Ну, ці я табе, Марыська, падабаюся гэтак моцна, што аж нямееш, і не можаш слова сказаць наконт таго, што ў цябе на думцы?

Марыська спачатку пачырванела, потым пытаецца, склаўшы рот у дзюбку:

— А ты ў Амерыку хочаш ехаць?

— А што? Паехала Агата, зрабіла прыемнасць „вольнай краіне" сваёй прысутнасцю, дый і хопіць. Двух свежых Арлянскіх хопіць на вялікую Амерыку.

— А я ведаю Арлянскіх старое даты, хочаш, афармлю табе ад іх запрашэнне. Дзяцей не маюць, старыя-старуленькія, дык і табе што перападзе.

А, тут цябе маю! Ведаеш мае болі наконт дзяцей! Якіх у мяне няма. Ды да каго з такім тэкстам? Да старога Вандала, які і сам час ад часу пазірае на Аўраамаў палетак? Жыві ты хоць сто гадоў, і дзе б ты ні быў, і кім бы ты не быў, то і так багацце, меншае ці большае, пакінеш тутака, з сабою нічога не забярэш.

— А што за Арлянскія ў тых Штатах? Мо якія сваякі? Не чуў... Агаціны кроўныя дык там пасяліліся былі, дзядзька дваюрадны, вось, Павал Казарэз, дык нават рэстаранчык меў. А як паехаў, дык і знік. Можа, там Агата неяк дойдзе, што за фірма была, і дзе хоць пахаваны, бо ўсё ж, было не было, радня. Узяла ж торбачку з зямелькай роднай Беласточчынай Агата, каб каму там на магілку сыпануць, такая яна рамантычная, мая жонка.

— Ат, старазаконныя тыя Арлянскія... Хочаш, дык цябе з імі пазнаёмлю...

— Чаму і не...

— Ну, вядома, па-знаёмству, як з цябе, Вандал, дык трыста злотых хопіць. Ну, вядома, трэ і пазваніць, і напісаць, і праз, той самы, Інтэрнэт, тое самае, спалучыцца...

— Я і сам магу... Ну, добра, ты там падумай... Ну, і я падумаю. Цікава, як тыя там Арлянскія... Старэнькія, кажаш...

Больш мы з Марыськай Піліпеняй не спаткаліся. Арыштавалі яе за ашуканствы. За свае абяцанкі выдзерла ад людзей больш за 30 тысяч злотых. Усё ад знаёмых. Самі, кажа, давалі, але да віны не прызнаецца.

Сеў я за камп'ютэр, стаў сам шукаць у вялікім свеце Арлянскіх. Мо і такі, як я, недзе ёсць?..

Вандал Арлянскі

Спецмісія Гаўрусіхі

У апошнія дні мядзведзь Сандар Жоржавіч выслаў лань Гаўрусіху са спецмісіяй у Паўночны лес. Ведаў, што ў яе там шмат сваякоў і вынюхае, што пішчыць у траве, а калі б што, паграбе капытцам дзе трэба. Гаўрусіха, значыць, паехала, прынюхалася, паграбла. Вярталася з пачуццём добра выпаўненага абавязку. На мяжы, аднак, лясныя мышы з асакі, якая пільнавала, каб тое што не трэба не дасталася ў Жоржавічаў лес, Гаўрусіху затрымалі.

— Ну, што яна рабіла ў Паўночным лесе?! — распытвала адна з шэрых лясных мышэй.

Іншая патрабавала:

— Хай яна пакажа капытцы.

Лань наёжылася:

— Я — сяброўка ўселяснога кіраўніцтва. Я выказваю пратэст. Я толькі перад шэфам магу прызнацца да таго, што рабіла там дзе была.

— Дубра, дубра. Мы там відаем свуё, — захмыкалі мышы.

У лані выбару не было. Прыніжаная, узняла путавыя костачкі і паказала капытцы. Урэшце мышы адчапіліся. Гаўрусіха дайшла на паляну на чарговы сход уселяснога кіраўніцтва спозненая. Задыханая і гнеўная прабалбатала:

— Пр... пра... правакацыя!

Рэшта кіраўніцтва прыглядалася лані са здзіўленнем. Толькі сядзячы на дубе дзяцел Стукач шматзначна паківаў дзюбай да Сандара Жоржавіча.

— Супакойцеся, Гаўрусіха. Прысядзьце сабе на імху. Дыхайце поўнымі грудзьмі, — супакойваў лань з бацькоўскім клопатам мядзведзь. — Нічога ж не здарылася, каб, гэта самае...

— Як гэта — нічога?! Мышы заглядвалі мне пад капыты! Мяне, сяброўку кіраўніцтва, патрактавалі, як нейкага падрыўнога гада! — не магла супакоіцца Гаўрусіха.

— Ланюшачка мая наймілейшая, — мядзведзь, што яму здаралася, здаецца, вельмі рэдка, паклаў пярэднюю лапу на ланінай спіне. — Так мела быць. Гэта не ў вас справа, а ў мышах.

Лань вытрашчыла вочы. Рэшта кіраўніцтва — вавёрка Кацюша, барсук Барушчук ды заяц Генадзь нахілілі ад здзіўлення свае думальныя органы.

— Ну, так, — працягваў Сандар Жоржавіч. — У таямніцы ад вас рашылі мы праверыць з дзятлам Стукачом, як мышы пільнуюць нашых межаў. Яны не ведалі, шаноўная Гаўрусіха, што вы — з кіраўніцтва. А вы, лань, выканалі сваё заданне проста перфекцыйна. Віншуем.

— Ну, а нашто было тое прынюхванне ды разграбанне ў Паўночным лесе? — дапытвалася ў мядзведзя Гаўрусіха.

— Ат, прыдасца. Як кажуць двухногія нелятучыя, мы „спяклі дзве смажаніны на адным агні", а па-нашаму — адным ударам двух зайцоў забілі.

Заяц Генадзь адвесіў губу ды скалануўся ад непрыемных асацыяцый.

Лань Гаўрусіха і апошнія члены кіраўніцтва ўздыхнулі з палёгкай. Зноў адчулі гонар за прадбачлівасць яго мядзведжай велічнасці.

МакХолад

ISSN 0546-1960